


Хутка і мінскі кінапракат будзе атрымліваць сусветныя кінанавінкі праз высакахуткасны інтэрнэт акурат у кінатэатры. Навошта? Чытайце падрабязней. СТАР 3



Беларус, якога блытаюць з Халкам Хоганам, распавёў, чаму Байран, Лондан і Хэмінгуэй займаліся боксам. СТАР 6



Рэакцыя чытачоў на артыкулы журналістаў часам бывае вельмі неадназначная. Спрэчкі «па тэме» і «тролінг» у інтэрнэце абмяркоўваюць у чарговай рубрыцы «Мая праўда». СТАР 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЖНІЎНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 162 (27527) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АБМЕРКАВАЛІ ПАРАДАК ДНЯ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч і дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгор Рапота абмеркавалі ўчора парадак дня маючага адбыцца Савета Міністраў СД, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Сустрэча адбылася ў беларускім урадзе. Бакі абмеркавалі найбольш актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, якія датычацца ў тым ліку і рэалізацыі сумесных праектаў.

Як адзначыў Рыгор Рапота, у гэтым напрамку назіраецца пазітыўная дынаміка. Так, ужо на маючым адбыцца пасяджэнні саюзнага Саўміна плануецца прадставіць для абмеркавання шэраг новых навукова-тэхнічных праграм. Яны, паводле слоў дзяржсакратара, закранаюць шырокі спектр напрамкаў — ад сельскай гаспадаркі да космасу.

## ТАРЫФНАЯ СТАЎКА ПЕРШАГА РАЗРАДУ З 1 ВЕРАСНЯ ВЫРАСЦЕ НА 4-5%

**Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік, адказваючы на пытанне БЕЛТА.**

«Урад прапануе павысіць з 1 верасня тарыфную стаўку першага разраду настолькі, наколькі дае магчымасць бюджэт. Праект дакумента знаходзіцца на ўзгадненні ў кіраўніка дзяржавы», — адзначыў віцэ-прэм'ер. Анатоль Тозік учора прыняў удзел у абласной нарадзе педагагічных работнікаў Брэсцкай вобласці, якая адбылася ў Жабінцы.

■ Школа чакае

## У АПОШНІ ДЗЕНЬ ЛЕТА

**Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя пачатку новага навучальнага года і сустрэчы з настаўнікамі, пройдуць у большасці беларускіх школ 31 жніўня.**

У новым навучальным годзе ў краіне ўводзяцца ў строй тры новыя школы — сярэдняя школа на 216 месцаў у вёсцы Доцішкі ў Воранаўскім раёне, сярэдняя школа ў мікрараёне «Лошыца-4» у Мінску і вучэбна-педагагічны комплекс «Сярэдняя школа—дзіцячы сад» на 950 месцаў у Салігорску. Плануецца, што за школьныя парты сёлета сядуць 99 тысяч першакласнікаў. У сталічных школах будзе адкрыта 811 першых класаў — на 20 класаў больш, чым летась.

Заняткі ва ўсіх навучальных установах пачнуцца 2 верасня. Па традыцыі першы ўрок у новым навучальным годзе пройдзе ў межах рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Я — грамадзянін Беларусі!» . Тэма ўрока — «Як ты сэрцу майму міла, дарагая Беларусь!» . Гасцямі навучальных устаноў у гэтыя дні стануць прадстаўнікі ўрада, кіраўнікі міністэрстваў, парламентарыі, вядомыя спартсмены, ветэраны, грамадскія дзеячы і пісьменнікі. У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 2 верасня адбудзецца мерапрыемства, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Дзякуй салдатам Перамогі за тое, што не ведаем вайны». У сталічнай гімназіі №41 пройдзе патрыятычны ўрок «Традыцыі мужнасці і гераізму захаваем і памножым».

Таксама 2 верасня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё рэспубліканскай акцыі «Тыдзень спорту і здароўя» і рэспубліканскага праекта «Кожнай школе — футбольны мяч». Для якаснага забеспячэння фізкультурна-спартыўных мерапрыемстваў Беларуская федэрацыя футбола плануе перадаць установам агульнай сярэдняй адукацыі 22 тысячы футбольных мячоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Жыллё

## КОШТ «КВАДРАТА»

**Сёлета кошт квадратнага метра для чаргавікоў складзе 5,9 млн рублёў. Аб гэтым паведаміла першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Ірына Архіпава на пасяджэнні працоўнай групы па праблемных пытаннях у будаўнічай галіне, паведамляе прэс-служба міністэрства.**

«Сярэднеўзважаны ж кошт 1 кв.м жылля для гэтай катэгорыі грамадзян на канец года будзе 5,4 млн», — удакладніла пазіцыю галіны першы намеснік міністра. Спадарыня Архіпава паведаміла, што ў наступным годзе для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і права на атрыманне льготных крэдытаў, плануецца пабудаваць 2,5 млн кв. м жылля. З іх 1 млн кв. м будзе ўзведзены па прынцыпе дзяржзаказу, яшчэ мільён — за кошт завяршэння пачатага будаўніцтва жылых дамоў, увод якіх намечаны на наступны год, яшчэ 500 тысяч жыллёвых «квадратаў» будуць узведзены ў сектары індывідуальнага будаўніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ПАЎНОЧНЫЯ КАВУНЫ



Фотаздымкі БЕЛТА.

**Каля 700 кілаграмаў кавуноў плануюць сабраць сёлета на ўчастку гародніны СВК «Ольгаўскае» Віцебскага раёна. Турэцкі гатунак кавуна «Дэмрэ» ўпершыню быў пасаджаны на плантацыі гаспадаркі ў гэтым годзе. Ён і стаў першапраходцам для самага паўночнага рэгіёна краіны.**



Кавун у руках загадчыка ўчастка гародніны Віктара КОРСАКА.

■ Свая справа

## ШОУ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА

**Атрымліваць вышэйшую адукацыю і адначасова мець свой бізнес жадае ледзь не кожны сучасны студэнт. У новым матэрыяле рубрыкі «Свая справа» мы пазнаёмімся з людзьмі, для якіх гэтая мара стала рэальнасцю. Што самае цікавае, марай яна не была і нарадзілася з самых альтруістычных намераў...**
**Як зрабіць цікавай навуку, адкуль узяць новыя ідэі і з чаго пачынаць — адказы на гэтыя пытанні чытайце ў матэрыяле.**



### Як усё пачыналася

Ілья КУРАШОЎ і Юля ГОЛІКАВА сябравалі з дзяцінства, разам вучыліся ў ліцэі. Як гэта часта бывае, сяброўскія адносіны ў пэўны момант перараслі ў нешта большае. Праўда, ужо тады хлопец з роднага Магілёва пераехаў у Мінск: пасля першага курса перавёўся з факультэта прыродазнаўства Магілёўскага ўніверсітэта імя Куляшова на хімфак БДУ. Зараз хлопцу 21, яго спадарожніцы — 20.

— Вучыцца ў Магілёве мне з цягам часу стала нецікава, — расказвае Ілья. — Я быў круглым выдатнікам, хоць і не прыкладаў ніякіх асаблівых намаганняў да вучобы. Таму аднойчы, калі прыехаў у Мінск, вырашыў зайсці ў БДУ, пацікавіцца, ці можна перавесціся на хімічны факультэт. Аказалася, што акадэмічная розніца зусім невялікая, а вольныя месцы ёсць. Таму я доўга не думаў і на другі курс пайшоў ужо ў сталічную ВНУ.

Тым часам Юля паступіла ў Магілёўскі ўніверсітэт на першы курс факультэта замежных моў. Але хутка яны зразумелі, што падтрымліваць адносіны на вялікай адлегласці цяжка. Дзяўчына, як і Ілья, таксама перавялася ў БДУ — на філфак. Праблем з пераводам не было: па словах дзяўчыны, у Мінску і Магілёве абсалютна ідэнтычныя праграмы, толькі два прадметы сталічныя студэнты здалі раней за яе. Яны і склалі акадэмрозніцу.

Ілья расказвае, што, як толькі трапіў у Мінск, апынуўся ў сапраўдным віры падзей: з'явіліся новыя сябры і першая праца — грузчыкам. Пасняховасць, праўда, значна знізілася: з рангу «выдатнікаў» хлопец перайшоў у «серадднякі».

Тым жа летам, калі Юля пераводзілася ў Мінск, маладыя людзі нават падчас усёй гэтай папяровай мітусні паспявалі забаўляцца. Аднойчы ім у рукі трапіў расійскі часопіс «Forbes». У адным з артыкулаў распавядалася гісторыя амерыканскага бізнесмена, які пры падтрымцы дзяржавы займаўся прыцягненнем дзяцей да навукі — паказваў ім цікавыя вопыты. Маштабы даволі сур'ёзныя — яго пазнавальная праграма трансліравалася нават па тэлебачанні. СТАР 2

■ Надвор'е

## СТАРТУЕ ВЕРАСЕНЬ ДАЖДЖАМІ

У пятніцу будзе без істотных ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе (Гомельская і Магілёўская вобласці) пройдуць невялікія дажджы, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.** Удзень 17-22 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 14-16 градусаў. Ужо ў суботу атмасферны ціск панізіцца, таму ўначы па паўднёвым усходзе, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ў ноч на суботу плюс 6-13 градусаў, удзень — ад 16 да 23 цяпла. У нядзелю атмасферныя франты прынясуць кароткачасовыя дажджы на ўсю тэрыторыю Беларусі. У асобных раёнах краіны магчымы навальніцы, уначы і раніцай — туман. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю 7-13 цяпла, па захадзе краіны — да плюс 15 градусаў, удзень — 16-24.

У панядзелак на нашу тэрыторыю завітаюць вільготныя і халаднаватыя паветраныя масы з боку Балтыйскага мора. Амаль паўсюдна па краіне чакаюцца дажджы. Пахаладае. Тэмпература ўначы 5-12 цяпла, удзень — плюс 13-18 градусаў, а па поўдні Беларусі — да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Май на ўвазе

## ВОСЕНЬ КЛІЧА НА ПАЛЯВАННЕ

**З 1 верасня па 31 студзеня ў светлы час сутак можна будзе паляваць на бабра і рачную выдру.**

— Спосаб палявання — як зброевы з падыходу, з засады, так і бяззброевы, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі. Што датычыцца дазволеных у гэты час прылад палявання, дык гэта наразная паляўнічая зброя з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўляў і гладкаствольныя стрэльбы з патронамі з кулямі, карцеччу і шротам дыяметрам ад 5 міліметраў. Дапускаецца выкарыстанне пастак і капканаў, а вось петлі — пад забаронай. У лютым паляваць на бабра і выдру можна будзе толькі бяззброевым спосабам, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

З першай суботы верасня пачынаецца паляванне на рабчыка, фазана, шэрую курапатку, а з трэцяй — на гусь (белалобую, шэрую, гуменніка) і канадскую казарку. Здабываць гэтых птушак можна будзе па другую нядзелю снежня. Для палявання дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную зброю і патроны са шротам. Уладальнікі маламерных суднаў могуць карыстацца імі, палюючы на гусей з пад'езду, аднак рухавік павінен быць адключаны.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЮРКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы:**

*«Прадстаўнікі расійскай малочнай галіны дастаткова высока ацэньваюць працу беларускіх калег. У той жа час кіраўнік Федэральнай службы Расіі па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека Генадзь Анішчанка заявіў, што беларускія малочныя прадукты нібыта не адпавядаюць стандартам якасці і бяспекі. Хачу нагадаць, што раней прадстаўнікі прадпрыемстваў «Danone-Юнімілк» з 13 рэгіёнаў Расіі наведвалі Пружанскі раён і пабывалі на малочнатаварных комплексах. Яны былі ўражаныя тым узроўнем вытворчасці малака, які ў нас ёсць. Яны заявілі, што Расіі вельмі далёка да гэтага ўзроўню. Таму я адказна магу сказаць, што сёння ў Беларусі па пытаннях якасці малака выканана велізарная работа, і лічбы кажуць самі за сябе. Напрыклад, Брэсцкая вобласць вырабляе ў год больш за 1 млн т малака, з якога львіная доля (60-70%) ідзе на экспарт у Расійскую Федэрацыю».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.08.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8990,00 | ▲ |
| Еўра | 11920,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 271,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1106,12 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 22° |
| Віцебск | + 19° |
| Гомель | + 16° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 20° |

ЗАВОЧНАЯ «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

### І пра страўнік, і пра печань

Пытанні прафілактыкі і лячэння стрававода, страўніка, кішэчніка, печані і падстраўнікавай залозы можна пакінуць па нумары газеты «Звязда» 8 (017) 287 18 29 да 5 верасня. На старонках нашага выдання на іх адкажуць дацэнты 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдаты медыцынскіх навук, урачы-гастраэнтэролагі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ і Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СІРЫЙСКІЯ ЎЛАДЫ ПРАВЯЛІ ЭВАКУАЦЫЮ СТРАТЭГІЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ

Сірыйскія ўлады правялі эвакуацыю стратэгічных аб'ектаў з-за інфармацыі аб падрыхтоўцы краін НАТА да нанясення ўдару па Сірыі, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле паведамлення тэлеканала « Аль-Арабія «, у Дамаску практычна поўнасцю завершана эвакуацыя цэнтраў сувязі, генеральнага і паліцэйскіх штабоў, камандавання вайсковых падраздзяленняў, урадавых устаноў і ведамстваў. Па інфармацыі тэлеканала, шэраг устаноў і штабоў размясціўся ў браніраваных будынках, размешчаных у крокавай даступнасці ад месцаў іх пастаяннага знаходжання. Частка штабоў перамясцілася ў школы, якія таксама маюць абарону на выпадак ракетнага абстрэлу. Раней паведамлялася, што ЗША разглядаюць планы нанясення ўдару па тэрыторыі Сірыі ў бліжэйшыя дні. Да межаў краіны ў Міжземным моры сцягнута значная групоўка амерыканскіх ВМС .

### РАСІЯ АДПРАЎЛЯЕ Ў МІЖЗЕМНАЕ МОРА НОВЫЯ КАРАБЛІ

У той час як да меркаванага пачатку ваеннай аперацыі заходніх краін у Сірыі застаюцца лічаныя гадзіны, сітуацыя працягвае абвастрацца. Суседнія краіны мабілізуюць арміі, дзяржавы паступова вывозяць сваіх грамадзян. Нават інспектары ААН, якія працавалі на месцы меркаванай хіматакі, спешна згарнулі дзейнасць. Расія тым часам працягвае выказваць незадаволенасць дзеяннямі ЗША і іх партнёраў і адначасова нарошчвае групоўку ВМФ у Міжземным моры. Карабельны састаў пастаяннага аператыўнага злучэння ВМФ у Міжземным моры ў бліжэйшыя дні будзе ўзмоцнены новымі караблямі, паведаміла ў чацвер крыніца ў расійскім Генштабе. Згодна з гэтай інфармацыяй, у бліжэйшыя дні групоўка павінна папоўніцца вялікім супрацьлодачным караблём Паўночнага флоту. Пазней да яе далучыцца ракетны крэйсер Чарнаморскага флоту «Масква». Увосень міжземнаморскую групоўку ВМФ павінен папоўніць ракетны крэйсер Ціхаакіянскага флоту «Вараг».

### ІЗРАІЛЬЦЯНЕ Б'ЮЦЦА Ў ЧЭРГАХ ПА ПРОЦІВАГАЗЫ

Супрацьгазавы бум, які пачаўся ў Ізраілі некалькі дзён таму пасля паведамленняў аб меркаванай хімічнай атацы ў прыгарадзе сірыйскай сталіцы, працягвае нарастаць на фоне чутак аб будучым ваенным удары Захаду па Сірыі. Тысячы людзей шмат гадзін запар стаяць у чэргах, каб атрымаць процівагазы. Ахвотных так многа, што з чацвярга паштовыя аддзяленні, куды прыходзяць партыі процівагазаў, будуць працаваць дадатковыя гадзіны. З-за месцаў у чарзе за процівагазамі ўзнікаюць канфлікты. У некаторых гарадах нават адбыліся бойкі, удзельнікаў якіх затрымала паліцыя. А ў Іерусаліме станцыя выдачы процівагазаў у гандлёвым цэнтры «Адан» была закрыта пасля таго, як натоўп уварваўся ўнутр і пачаў расхопліваць процівагазы без рэгістрацыі, баючыся, што на ўсіх не хопіць. Між тым, некаторыя ізраільцяне вырашылі зарабіць на ажыятажы. Новыя процівагазы ў арыгінальнай упакоўцы, якія бясплатна выдаюцца грамадзянскаму насельніцтву, ужо з'явіліся на аўкцыённай інтэрнэт-пляцоўцы.

### ПАЛІЦЫЯ НЬЮ-ЁРКА ПРЫРАЎНЯЛА МЯЧЭЦІ ДА ТЭРАРЫСТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Паліцыя Нью-Ёрка выдала сакрэтнае распараджэнне, згодна з якім усе мячэці горада прыраўноўваюцца да тэрарыстычных арганізацый, перадаюць інфармагенцтвы. Згодна з распараджэннем, паліцыя мае права весці назіранне за мячэцямі, а таксама ўсталёўваць у іх шпіёнскую апаратуру. Акрамя таго, супраць любога верніка мячэці можа быць распачата расследаванне, для якога не патрабуецца доказаў дачынення чалавека да крымінальных правапарушэнняў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КІВІ — ЗАМЕНА АНТЫДЭПРЭСАНТАМ І ЭНЕРГЕТЫКАМ



Калі з'ядаць у дзень па дзве штукі ківі, можна палепшыць сабе настрой і прадухіліць развіццё дэпрэсіі. Універсітэт Атага спецыяльна назіраў за групай з 54 маладых людзей на працягу 6 тыдняў, каб выявіць заяўлены эфект ківі. Аказалася, менавіта 2 ківі змяншалі стомленасць і праявы дэпрэсіі, давалі зарад энергіі на дзень. Мяркуючы па ўсім, прычына ў канцэнтрацыі вітаміну С у гэтых экзатычных пладах. 2 ківі дастаткова, каб давесці ўзровень вітаміну да рамак нормы. Вітамін С актывуе шэраг энзімаў, павышае ўзровень метабалічнай энергіі і розных злучэнняў у мозгу чалавека. У цэлым вітамін мацуе не толькі мозг, але ўвесь арганізм , даючы разумовую і фізічную энергію, піша Journal of Nutritional Science.

# НЕ ЗНАХОДКА, А СЕНСАЦЫЯ!

## І НАГОДА ЗАДУМАЦЦА ПРА НАШЫ СКАРБЫ

**Пад Мсціславам у рацэ Віхра знайшлі ўнікальныя даспехі рыцара, але старажытную зброю з яго паспеў звезці ў Маскву «чорны капальнік».**



Ігар МАРЗАЛЮК з незвычайнай знаходкай.

Рыцарскія даспехі пачатку XVI стагоддзя ваяра Вялікага Княства Літоўскага ў выдатным стане назвалі археалагічнай сенсацыяй. Загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар Ігар Марзалюк лічыць даспехі нават самай значнай знаходкай стагоддзя, калі казаць пра сярэднявечную археалогію.

Аднак аказалася, што гэта гісторыя не толькі здабытку, але і страты.

— Пачну з таго, што ў нас цяпер проста катастрафічная сітуацыя з адкрытай мяжой, праз якую ў Расію вывозяць нашы гісторыка-культурныя каштоўнасці, — расказаў Ігар Марзалюк. — Прыехаў на Мсціслаўшчыну маскоўскі дайвер, «чорны» здабытчык прадметаў часоў Другой сусветнай вайны. Яго геасканер зафіксаваў на дне Віхры нешта вялікае і жалезнае. Ён падняў з гэтага месца меч ваяра, дзіду і тры баявыя сякеры. Людзі, якія бачылі ўвесь гэты працэс, паведамілі аператыўна, але тут усяго некалькі дзясяткаў кіламетраў да мяжы, і свае знаходкі расіянін паспеў вывезці. А мы пачалі падводныя раскопкі. СТАР 8

■ На слыху

# СПОРТАМ АДЗІНЫМ

## Першы ў Беларусі спартыўны тэлеканал да каманды «На старт!» гатовы

**Размовы пра яго стварэнне доўжыліся некалькі гадоў, падаграваючы інтарэс грамадскасці. Скептыкі звыкла не верылі, казалі пра недахоп уласных тэхнічных магутнасцяў і творчых магчымасцяў, аптымісты ўпарта спадзяваліся на лепшае. Пасля таго, як сёлета ўвесну ініцыятыву прыспешыў Прэзідэнт, стала канчаткова зразумела: нацыянальнаму спартыўнаму каналу — быць! Ужо вядомая яго назва — «Беларусь-5» — і прыкладны час запуску: IV квартал 2013 года. Ці для ўсіх беларусаў будзе даступнай новая «кнопка» і ў чым яе адметнасць, «Звязда» распытала кіраўніка дырэкцыі спартыўнага вяшчання Белтэлерадыёкампаніі Паўла БУЛАЦКАГА.**



***— Пачну з галоўнага пытання, якое, напэўна, задаюць сабе ўсе беларускія балельшчыкі без выключэння: ну калі ж? Афіцыйная версія гучыць досыць расплывіста...***

— Мы ўжо знаходзімся на фінішнай прамой. Дырэкцыя «Беларусь-5» пачне працаваць з 1 верасня. У верасні стартуе і тэставае вяшчанне канала ў межах Белтэлерадыёкампаніі. Гэта значыць, што шырокі глядач яго яшчэ не ўбачыць, пакуль спецыялісты, найперш тэхнічныя, не адточаць усе магчымыя нюансы і шурпатасці, якія могуць узнікнуць падчас трансляцыі. У залежнасці ад таго, якія будуць узнікаць праблемы, і ад хуткасці іх вырашэння і вызначым афіцыйнага дату адкрыцця спартыўнага тэлеканала. Хочацца ж, каб з першага эфіру ўсё было без памылак, каб тэлевізійны «бруд» на першы план не выходзіў. Вядома ж: усе разбіраюцца ў спорце і ў тэлебачанні, а мы адкрываем спартыўны тэлеканал — уяўляеце, якая адказнасць! *(Смяецца)*.

***— Неаднаразова гучала інфармацыя, што «Беларусь-5» увойдзе не ў агульнадаступны пакет, а ў пакеты кабельных аператараў...***

— На маю асабістую думку, падобны тэлеканал увогуле мусіць быць платным. Цяпер мы (маю на ўвазе дырэкцыю спартыўнага вяшчання), дорым вельмі шмат спартыўных спаборніцтваў топ-узроўню — Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Еўропы па футболе, Лігу чэмпіёнаў, КХЛ — фактычна бясплатна. На ўсіх замежных каналах, нават у суседніх краінах, усё гэта распаўсюджваецца толькі праз платныя каналы. І ў перспектыве, каб зменшыць фінансавую нагрузку на Белтэлерадыёкампанію, на дзяржаву, мы б хацелі, каб людзі, атрымліваючы якасны тэлевізійны спартыўны прадукт, плацілі за яго, як гэта робіцца ва ўсіх цывілізаваных краінах.

Што ўбачаць гледачы на «Беларусь-5»? Усе згаданыя вышэй «топавыя» спаборніцтвы, сусветныя і еўрапейскія турніры з удзелам беларускіх спартсменаў і самыя значныя першынствы краіны па гульнявых відах спорту.

***— Складваецца ўражанне, што ў прыярытэце будуць, так бы мовіць, больш «раскручаныя» футбол, хакей, тэніс. Між тым мноства суайчыннікаў не ведае, напрыклад, пра дасягненні беларусаў у кіберспорце...***

### Дзяўчаты, якія любяць і разбіраюцца ў спорце, вы нам патрэбны!

— Дарэчы, мы плануем рабіць на «Беларусь-5» праграму пра кіберспорт! Але нашы заўзятары, і гэта пацвярджаюць рэйтынгі, любяць глядзець спаборніцтвы, у якіх беларусы ўдзельнічаюць і выйграюць — калі гуляе Азаранка, калі страляе Домрачава. Таму мы не можам не паказаць тэнісныя спаборніцтвы, не можам не паказаць чэмпіянат свету па біятлоне, Лігу чэмпіёнаў (яна, між іншым, будзе прадстаўлена на спартыўным канале больш шырока, чым цяпер). Вельмі шмат нараканняў на наш адрас гучала наконт «Беларусь-2» з-за паказу некаторых матчаў у запісах. Дык вось, на «Беларусь-5» мы зможам паказваць спорт больш зручна для балельшчыкаў, перадусім робячы ўпор на прамыя трансляцыі. І толькі калі нейкія падзеі будуць адбывацца адначасова, «развядзём» іх па розных каналах. Пры гэтым з другой «кнопкі» спорт ні ў якім выпадку не знікне, толькі некаторыя праграмы зменяць прапіску.

***— Аматары спорту тэлефануюць, хвалююцца: ці ўбачаць у наступным сезоне чэмпіянат Англіі па футболе?***

— Зараз ідуць перамовы, каб вырашыць гэту праблему. А гэта сапраўды праблема: з аднаго боку, мы прывучылі беларускіх гледачоў да якаснага футболу, а з другога — чэмпіянат Англіі на сёння — нумар адзін у свеце і самы дарагі для паказу. Нашы заходнія калегі запрошваюць проста шалёныя грошы. І штогод цана правоў павялічваецца працэнтаў на 10-15. Але, мяркую, прафесіяналізму нашых супрацоўнікаў хопіць, каб вырашыць гэта пытанне станоўча.

***— Адных прамых трансляцый усё ж мала для паўнавартаснага спартыўнага канала. Чым яшчэ плануецца запаўняць эфір — новымі аўтарскімі праграмамі, вытрымкамі з архіваў?***

— Беларусі ёсць што прыгадаць і чым ганарыцца ў гэтай галіне спорту, таму ў нас запланаваны да паказу цыкл «Залатыя імгненні беларускага спорту». У life-рэжыме будзем паказваць найбольш цікавыя моманты з дасягненняў беларускіх спартсменаў: як забіваюць шайбу шведам, як бягуць да алімпійскага «золата» і г.д. Упэўнены, кожны з заўзятараў з задавальненнем паглядзеў бы яшчэ раз хакейны матч Беларусь — Швецыя на Алімпіядзе-2002 — такія «залатыя» гульні мы таксама плануем паказваць. На жаль, не ўсе яны захаваліся ў нас, як, прыкладам, матчы гандбольнага СКА ў Лізе чэмпіёнаў. Таму мы зараз выходзім на архівы расійскага тэлебачання, каб набыць у іх правы на паказ гэтых матчаў.

### На «Беларусь 5» мы зможам паказваць спорт больш зручна для балельшчыкаў, перадусім робячы ўпор на прамыя трансляцыі.

***— Цяпер у складзе спартыўнай дырэкцыі налічваецца крыху больш за 10 каментатараў.* Колькі яшчэ трэба для новага *канала і як ідзе абвешчаны Белтэлерадыёкампаніяй кастынг спартыўных каментатараў і журналістаў?***

— Шчыра кажучы, абвяшчаючы кастынг, мы чакалі значна меншай рэакцыі, чым атрымалі ў выніку. Ужо на мінулым тыдні колькасць заявак набліжалася да сотні, а ўлічваючы, што мноства заявак прыходзіць у апошні момант, да 2 верасня гэта лічба можа істотна павялічыцца. Але трэба разумець, што каментатар — гэта «штучная» прафесія, стаць ім вокамгненна, шчоўкнуўшы пальцамі, нельга, трэба шмат вучыцца і працаваць у эфіры. Апошнім разам падобны адбор адбываўся 10 гадоў таму, і з яго «прыжыўся» толькі адзін каментатар — Аляксандр Дзмітрыеў. Таму цяпер актыўна шукаем новыя, маладыя галасы, каб вырасціць яшчэ 3-4 прафесіяналаў. А выбіраць, безумоўна, будзе з каго: нечакана для нас прыходзяць заяўкі з іншых тэлеканалаў, нават з іншых краін, і нават ад алімпійскіх чэмпіёнаў!.. У ідэале, на кожны від спорту мусіць быць некалькі каментатараў, бо ў жыцці ўсякае бывае: так, Уладзімір Мікалаевіч Навіцкі, каментуючы спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, што праходзілі ў Маскве, захварэў і страціў голас, апошнія тры дні гераічна трымаўся на антыбіётыках. Каб такога не было, безумоўна, трэба мець падстрахоўку.

### Упэўнены, кожны з балельшчыкаў з задавальненнем паглядзеў бы яшчэ раз хакейны матч Беларусь-Швецыя на Алімпіядзе-2002.

***— Апошнім часам пра спорт усё больш актыўна расказваюць і пішуць дзяўчаты. Для іх на «Беларусь-5» знойдзецца месца?***

— І не проста знойдзецца. Перш за ўсё ў адборы мы звяртаем увагу менавіта на дзяўчат. Бо раней «жаночым голасам» Алімпійскіх гульняў звычайна была Інга Хрушчова, а паколькі яна звольнілася з БТРК, тут узнік прабел. Атрымліваецца, на бліжэйшыя Алімпійскія гульні едуць адны каментатары-мужчыны — пытанне, каму ж каментаваць, скажам, фігурнае катанне, пакуль вісіць у паветры. Так што мы шукаем жаночыя галасы. Карыстаючыся выпадкам, запрашаю: дзяўчаты, якія любяць і разбіраюцца ў спорце, прымайце ўдзел у нашых кастынгах, вы нам патрэбны!

***— Не магу не запытацца пра месца беларускай мовы на спартыўным канале — усё ж беларускамоўнае каментаванне многія балельшчыкі ўхваляюць.***

— Сапраўды, у нас ёсць некалькі каментатараў з добрай беларускай мовай: Уладзімір Навіцкі, Павел Баранаў і іншыя. Паколькі большасць спартыўных балельшчыкаў усё ж рускамоўныя, то прыярытэт у трансляцыях застанецца за рускай, але і пра беларускую мову мы ні ў якім разе не забываемся, пэўную частку трансляцый з задавальненнем будзем весці па-беларуску.

**Гутарыла**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ На экранах

# КІНО «ПАСКОРЫЦЦА»

**Найноўшыя дасягненні сусветнай кінаіндустрыі будуць перадавацца ў кіназалы з дапамогай высакахуткаснага інтэрнэту. Пра гэта паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Кінавідэапракат» Васіль Коктыш.**

— Зараз для таго, каб у тым ці іншым кінатэатры пачалі дэманстраваць пэўны фільм, яму прысвойваецца ўнікальны электронны ключ. З яго дапамогай адкрываецца доступ да запісу. Прычым прывозяць запіс у Беларусь на сродкі праваўласнікаў, а адпраўляюць назад за кошт беларускага боку. Прыкладна з пачатку будучага года ўсе запісы будуць дастаўляцца электронным шляхам, з дапамогай хуткаснага інтэрнэту, — сказаў выступоўца.

Васіль Коктыш адзначыў, што разглядаўся яшчэ варыянт перадачы праз спадарожнік, але пасля шматлікіх кансультацый з замежнымі партнёрамі ад гэтай ідэі адмовіліся, паколькі сігнал можа быць няўстойлівым.

Расказаў гендырэктар «Кінавідэапракату» яшчэ пра адно новаўвядзенне, першыя крокі да якога ўжо зроблены.

— Нядаўна мы набылі сістэму, што падтрымлівае частату ў 48 кадраў за секунду, — паведаміў Васіль Коктыш. — Такое абсталяванне зараз маецца ў некаторых залах кінатэатраў «Беларусь», «Бярэсце», «Аўрора» і «Мір». Мы пайшлі на гэты крок найперш па той прычыне, што менавіта такі фармат у будучыні стане самым папулярным у галівудскіх рэжысёраў. Напрыклад, славуты Джэймс Кэмеран, сярод прац якога неверагодна запатрабаваны гледачамі фільм «Аватар», збіраецца выпусціць другую яго частку, карыстаючыся менавіта такой частатой.

Што ж датычыць пераводу мінскіх кінатэатраў з плёнкі на «лічбу», то гэты працэс фактычна скончаны. Лічбавага абсталявання пакуль няма толькі ў двух кінатэатрах — гэта «Перамога» і «Масква». Першы ў наступным годзе будзе капітальна рамантавацца, а час рэканструкцыі другога зацягваецца з-за таго, што пакуль не вырашаны лёс Тэатра-студыі кінаакцёра, які месціцца ў адным будынку з кінатэатрам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Культурная сталіца

# У МАГІЛЁВЕ МОДНА ЧЫТАЦЬ НА ЛАВЕ

**Магілёўскія бібліятэкі завяршаюць «Лета пад кніжным парасонам», а сустракаюць восень у Быхаве выставай «Культурная сталіца».**

Сёлетнім летам Магілёўская гарадская бібліятэка імя Карла Маркса ўпершыню апрабавала новую форму работы з чытачамі. Двойчы на тыдзень яе супрацоўнікі ва ўніформе з запасам літаратуры і вялікім парасонам ад сонца выходзілі ў скверы ў цэнтры горада і ладзілі імправізаваныя «выязныя чытальныя залы».

Ухіл зрабілі на часопісы, якія зручна гартаць на лавах у парку падчас адпачынку. Асноўнымі чытачамі сталі пенсіянеры і маладыя маці. Таму асаблівай папулярнасцю карысталіся спецыялізаваныя часопісы для маці і дзіцяці, звесткі пра здаровы лад жыцця, жаночыя выданні, а мужчыны нязменна аддавалі перавагу «Рыбалову». Калі людзі хацелі пачытаць на вуліцы кнігі ці ўзяць іх дадому, то наступным разам бібліятэкары выконвалі іх замовы.

Увогуле акцыя аказалася паспяховай: за лета рады чытачоў бібліятэкі папоўнілі 300 чалавек.

— Наша ідэя спадабалася магілёўцам, — сказала **дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк Магілёва Галіна Краўчанка.** — Таму «Лета пад кніжным парасонам» стане традыцыйным.

А сёлетнюю восень магілёўскія бібліятэкі сустрэнуць у Быхаве, на **Дні беларускага пісьменства, дзе прадставяць вялікую выставу «Культурная сталіца».**

— Там будзе афіцыйная частка з фотаздымкамі і дакументамі: як і за што Магілёў атрымаў ганаровае званне, — расказала Галіна Краўчанка. — Мы раскажам з дапамогай кніжак пра наш горад, яго славутасці, архітэктурныя помнікі, знакамітых асоб. А таксама прадставім сваю прадукцыю: калі кніжак пра горад не хапае — мы выдаём іх самі. Напрыклад, даведнік пра 10 месяцаў, якія трэба абавязкова наведаць у абласным цэнтры, і новую дзіцячую кніжку пра друкарства ў Магілёве.

**Ілона ІВАНОВА**

# КОШТ ПАКЕТА ТЭЛЕПРАГРАМ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

**З 1 верасня «Мінскія тэлевізійныя інфармацыйныя сеткі» змяняюць кошт пашыранага пакета тэлепраграм для жыхароў сталіцы.**

Як паведамляе МТІС на сваім сайце, за прагляд 22 каналаў абаненты, што пражываюць у мікраараёне Сокал, будуць плаціць 16 512 рублёў замест 14 532 рублі, астатнія мінчане — 16 080 рублёў замест 14 232 рублёў. А вось аплата за прагляд 23 каналаў павялічваецца да 16 968 рублёў (дагэтуль гараджане плацілі за гэты пакет 14 988 рублёў), 24 каналаў — да 17 856 рублёў (15 744 рублі), 25 каналаў — да 18 744 рублёў (16 500 рублёў). Максімальны пакет з 53 тэлеканалаў будзе цяпер каштаваць 43 608 рублёў замест ранейшых 37 668 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Медыяпрастора

# «ЗЯЛЁНАЯ ХВАЛЯ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

Вядучы папулярнай сярод аўтааматараў радыёпраграмы «Зялёная хваля» Аляксей Аніковіч нядаўна апынуўся ў непрыемнай сітуацыі. У выхадны дзень, калі ён ехаў па трасе М1/Е30 міма Барысава, журналіст страціў пярэдні рэгістрацыйны нумар. Страта была выяўлена толькі позна ўвечары, калі вядучы вярнуўся ў Мінск. На жаль, перасоўвацца на аўтамабілі без нумарнога знака забаронена, і ў такой сітуацыі можа апынуцца любы кіроўца. Не ўсе пакуль ведаюць, што рабіць далей. Але Аляксей Аніковіч вядзе праграму ўжо больш за 10 гадоў і ведае, як трэба дзейнічаць, таму праблема была вырашана ў кароткі тэрмін.

Каб быць у курсе, як вырашыць тую ці іншую праблему на дарозе, атрымаць адказ на многія пытанні ад прадстаўнікоў ДАІ, слухайце радыё «Мір» кожную сераду ў 14.15! Праграма «Зялёная хваля» — гэта сумесны праект радыё «Мір» і УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь, дзе любы ахвотны можа задаць сваё пытанне спецыялісту. Тэлефануйце ў прамы эфір па тэлефоне ў Мінску 2-101-471, адпраўляйце SMS на кароткі нумар 2424 або пакідайце пытанні на сайце radiomir.by. Граматна вырашайце свае аўтамабільныя праблемы і заставайцеся на «мірнай» хвалі!

# FM-РЭАЛІЦІ-ШОУ НА МВ-РАДЫЁ

97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна;
102,4 FM — Мядзел;
102,6 FM — Крупкі;
104,2 FM — Барысаў;
104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы;
105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань;
105,5 FM — Беразіно, Чэрвень;
105,6 FM — Старыя Дарогі;
107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.

Што будзе, калі за адным сталом апынуцца наймальнік, які вырашыў звольніць супрацоўніка, і сам супрацоўнік, якога гэтая перспектыва не задавальняе? Пачнуцца перамовы, а калі дакладней — паядынак перагаворшчыкаў. Як правіла, такія слоўныя баталіі праходзяць пры зачыненых дзвярах і без сведак. І часта па іх сканчэнні ўдзельнікі кусаюць локці і думаюць: «адкажы мы не так, а па-іншаму, зыход спрэчкі быў бы на нашу карысць». МВ-радыё прыадчыніць дзверы офісаў, каб наш слухач, апынуўшыся ў падобнай сітуацыі, быў у поўным узбраенні. Увосень у эфіры радыёстанцыі стартуе шосты сезон праекта «Светлыя галовы». На гэты раз у змаганне ўступяць топ-менеджары кампаній. У фінал выйдзе самы пераканаўчы. Партнёрам праекта на МВ-радыё выступіць «Клуб кіраўніцкіх паядынкаў POEDINOK.BY» і яго вядучы Сяргей Крупенін. Больш падрабязна аб праекце на сайце www.mvradio.by.

Традыцыйна ў верасні на МВ-радыё стартуе новы сезон. З'явяцца цікавыя праекты, новыя галасы, але стыль МВ застанецца нязменным — станцыя з унікальным інфармацыйным кантэнтам. У тым ліку будзе ўвасоблена канцэпцыя Breaking News, з дапамогай якой шлях у эфір для актуальнай і цікавай падзеі істотна скароціцца, навіна будзе падавацца выключна «гарачай», без прывязкі да часу. МВ-радыё не абмяжуецца ў сваіх кантактах са слухачом толькі FM-прасторай: да інтэрактыўных ток-шоу дадасца карцінка, самыя цікавыя выйдуць у інтэрнэт і на TV. Усё гэта — у абрамленні свежых хітоў і эксклюзіўных трэкаў, якім адводзіцца асаблівае месца ў абноўленым музычным фармаце.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 2 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 22.50** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Меладрама «Пад прыцэлам кахання».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15** «Зорнае жыццё». «Маммчыны сынкі».
**14.15** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Дак. серыял «Усе грані вар'яцтва».
**16.30** Усё як трэба!
**16.55 Камедыя «Сям'я».**
**19.20** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**19.55 Серыял «Вангелія». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**23.30** Дзень спорту.
**23.40 Баявік «Містар і місіс Сміт».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Жураў».**
**10.15** «Навіны надвор'я».
**10.50, 0.00** Дак. серыял «Пад сонцам».
**11.50, 23.10 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**13.10 Меладрама «Нахабніца». 1-я — 4-я, заключная, серыі.**
**16.45** Беларуская часінка.
**19.00 Серыял «Сяброўка Восень». 1-я і 2-я серыі.**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». 1-я серыя.**
**22.40** Авертайм.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.00, 16.00, 23.45** «Мой горад». Буда-Кашалёва.
**8.15** «Вобраз героя. Тадэвуш Касцюшка». Дак. фільм.
**8.35** «Маем рэчы». Ручнікі.
**8.55** «Сінематыка». Рэжысёр і кампазітар Ігар Волчак.
**9.35, 18.55** «Лабірынты».
**10.00** «Месца сустрэчы. Школа». Канцэрт.
**11.15** «Гісторыя беларускага тэатра. Нараджэнне». Дак. фільм.
**11.45** «Палескі пачастунак». Тушаная капуста.
**12.15 «Меншы сярод братоў». Драма.1-я і 2-я серыі.**
**14.50** «Сібірскі казачнік».
**15.35** «Карані».
**16.15, 22.55** «Эпоха ВІА». Дак. фільм. Частка 1-я.
**17.10** «Збянтэжаны Саўка». Кароткаметражны фільм.
**17.45** «Росчырк часу».
**17.55** «Творцы». Дырыжор Юрый Яфімаў.
**18.35** «Самы лепшы домік». Навукова-папулярны фільм.
**19.20** «Скарбніца Гарадзейшчыны».
**19.50** «Ленінградка». Дак. фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Загад». Драма. 1-я і 2-я серыі.**

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10 Серыял «Жаночы доктар 2».**
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Вольф Месінг: які бачыў скрозь час».**
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Прыгажосць: місія выканальная».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Тэрарыстка Іванова».**
**22.15 Серыял «Цюдоры».**
**0.20** «Біл Гейтс. Гісторыя поспеху».
**2.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Жыць будзеце».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 Серыял «Слова жанчыне».**
**12.30** «Джэймі ў сябе дома-2».
**13.00** «Жанчыны XX стагоддзя».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Дайджэст.
**15.30** «Ежа багоў».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Падманутыя навукай».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.40 Маст. фільм «Іншы мужчына».**
**22.25** Дзённік IX Міжнароднага конкурсу эстрадных выканаўцаў «Усходні базар».
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.40 Серыял «Фірменная гісторыя».**

### МІР

**5.00 Серыял «Агонь кахання».**
**6.40 Серыял «Арабела вяртаецца».**
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**9.10 Маст. фільм «Чэгемскі дэтэктыў».**
**10.45** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 2.30 Серыял «Клон».**
**15.25, 22.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20, 23.20 Серыял «Апошні сакрэт Майстра».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Закон і парадак».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Адукаваныя зоркі».
**1.00 Маст. фільм «Мой лепшы сябар».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55, 17.10 Серыял «Валошкі».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Каханне на мільён».**
**22.30 Серыял «Прынцып Хабарава».**
**23.40** «Дзяжурны па краіне. Міхаіл Жванецкі».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.55** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «І зноў прывітанне!».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Бамбіла. Працяг».**
**21.20 Серыял «Каўбоі».**
**23.30 Серыял «Карпаў».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.30, 18.35, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с.
**7.30, 14.25 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.15, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».**
**10.00** «Сінематограф». «Гром нябесны».
**11.35** Вестэрн «Джанга».
**16.10** Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
**16.30** «Мой любімы гадавanec».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**18.40 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Слаўныя хлопцы».**

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00, 19.00 Серыял «Метад Лаўровай».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00** Скетч-шоу «Адны дома».
**12.30** «Куды прыводзяць мары».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**20.00 Серыял «Кухня».**
**21.10 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**9.10, 23.10** Легенды крымінальнага вышуку.
**9.40, 16.15, 0.45** Судовыя справы.
**10.20, 16.55, 1.25** Сямейны суд.
**11.10** Дак. фільм «Асцярожна: НЛА».
**12.20, 15.55, 0.25** Дак. серыял «Жывое багацце Украіны».
**12.40, 18.25, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».**
**13.25** Пазавочы.
**14.00, 23.40** Не можа быць.
**14.25 Маст. фільм «Дзісай».**
**17.40, 4.15** Давай пажэнімся!
**19.15, 2.15** Ток-шоу «Датычыцца кожнага».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30, 3.30 Серыял «Запарогі».**
**21.15, 5.50 Маст. фільм «Зялёны фургон». 1-я серыя.**
**22.25** Брама часу.
**0.05** Феерыя падарожжаў.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2009 год.
**6.10** «Пад знакам задыяка. Дзева». 1992 год.
**7.45** «Шынок 13 крэслаў». 1973 год.
**9.00** «Таблетку пад язык». Фільм-спектакль. 1978 год.
**11.00** «Чырвоная шапачка». Тэлеспектакль для дзяцей. 1984 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Школа-студыя МХАТ. Учора, сёння, заўтра». Дак. фільм.
**14.00** «Што? Дзе? Калі?». 1990 год.
**15.35** «Дарослыя дзеці». Канцэрт.
**16.35** «Падзорная труба». Кароткаметражны фільм.
**17.00** «...Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**17.45** «А я іду...». Фільм-канцэрт.
**18.10** «Эскіз да партрэта». Дак. фільм.
**18.40 «Белы шаман». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Бенефіс Таццяны Даронінай». Фільм-канцэрт.
**23.00** «Будзільнік». 1988 год.
**23.40** «Тэлескоп». 1995 год.
**0.15** «Тэмп». 1992 год.
**0.50 «Мільён прыгод. Востраў іржавага генерала». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама». 1988 год.

### EUROSPORT

**4.00, 8.00, 11.45, 15.45, 18.45, 22.05** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША.
**10.15** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**11.00** Ралі. IRC.
**11.30** Мотаспартыўны ўік-энд.
**13.30** Снукер. 6-reds. Чэмпіянат свету.
**15.30** Вось гэта дзіва!!!
**17.00** Веласпорт. Вуэльта.
**22.00** Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** «Паміж намі».
**5.15, 5.40, 8.00, 8.25, 2.20, 2.45** Серыял «Месяцавы хлопчык».
**6.15** Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
**9.00** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**10.40, 12.35, 13.45, 15.45, 16.45, 20.40, 21.50, 23.35, 1.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Камедыя «Невынішчальны шпіён».
**12.55, 13.20, 16.00, 16.20, 21.00, 21.25** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**14.10** Камедыя «Аўтобусны прыпынак».
**17.20** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**19.20** Камедыя «Сёння я сплю з табой».
**22.10** Камедыя «Фантоцы бярэ рэванш».
**23.55** Камедыя «Джоні ў кіно».
**0.10** Камедыя «Машына часу ў джакузі».
**3.25** Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Прыгоды «Вох, ужо гэтая Наста!».
**3.15, 9.15, 15.15** М/с «Доктар Айбаліт». Зборнік м/ф. «Куплю прывід», «Тры Панькі гаспадараць», «Кот, які ўмеў спяваць».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Чорны пірат». Казкі замежных пісьменнікаў. «Халіф-бусел». Рускія народныя казкі «Дзераза».
**5.00, 11.00, 17.00** Кінааповесць «Дзіўныя дарослыя». М/ф «Па ўласным жаданні».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Хрыстафор Калумб».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Сіла слова», «Калі запальваюцца ёлкі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.50, 18.30, 3.20** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.45** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**15.05, 0.40, 5.15** Серыял «Менталіст».
**20.45** Серыял «Контргульня».
**21.45** Серыял «Пелагія і белы бульдог».
**22.45** Маст. фільм «99 Франкаў».
**1.30** Серыял «Звышнатуральнае».
**2.20** Серыял «Паляўнічыя на чужых».

### ТБ1000

**5.00** М/ф «Лаві хвалю!».
**7.00** Камедыя «Школа рока».
**9.00** М/ф «Палярны экспрэс».
**11.00** Камедыя «Пастка для нявесты».
**12.40** Камедыя «Мноства».
**15.00** Меладрама «Брудныя танцы 2».
**16.35** Баявік «Даміно».
**19.00** Жахі «Готыка».
**20.45 Драма «Неўтаймоўныя сэрцы».**
**22.50** Драма «Я так даўно цябе кахаю».
**0.55** Трылер «Адлік забойстваў».
**3.05** Трылер «Ідэальны незнаёмец».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Подпоручик Ромашовъ».
**8.30** Меладрама «Мамы».
**10.25** Баявік «Ільвіная доля».
**12.20** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў (2)».
**13.50** Драма «Матч».
**16.00** Камедыя «Шапіто-шоу: Каханне і сяброўства».
**18.00** Камедыя «Шапіто-шоу: Павага і супрацоўніцтва».
**20.00** Баявік «SLOVE». Прама ў сэрца».
**22.00** Драма «Жывы».
**0.00** Меладрама «Мой хлопец — анёл».
**2.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 2».
**4.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 22.00, 1.00, 4.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00** Па слядах міфічных пачвар.
**7.00, 10.00** Гіена: царыца драпежнікаў.
**8.00, 13.00** Дзікі тунец.
**9.00, 14.00** Каралі рыбалкі.
**11.00** Аферысты і турысты.
**12.00, 18.00** Машыны.
**15.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**16.00** У пошуках гіганцкага васьмінога.
**17.00, 2.00** Вайна генералаў.
**19.00, 19.30** Скарбашукальнікі.
**20.00, 0.00, 3.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**23.00** Уцёкі.
**2.00** Вайна генералаў: Ардэнская аперацыя.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Самагоншчыкі.
**7.50, 8.15** Неверагодная хуткасць.
**8.40, 20.05** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.35, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 10.05, 17.20, 17.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 0.00** Экспрэс-курс.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**12.20, 3.05** Выжыць разам.
**13.15, 0.55** Top Gear.
**14.10, 6.05** Круты цюнінг 2012.
**15.05** Пятая перадача.
**15.30, 5.10** Супер'яхты.
**18.15** Паўночная Амерыка.
**19.10** Лепшы рыбалоў.
**21.00** Палёты ўглыб Аляскі.
**22.00** Паветраныя дальнабойшчыкі.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**1.50** Нічога асабістага.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

Дзмітрый ЦІХАМОЛАЎ:

# «АДНОЙЧЫ ШУМАХЕР ПЕРАБЛЫТАЎ МЯНЕ З ХАЛКАМ ХОГАНАМ»

**Людзі нездарма кажуць: «Добры стырнавы — палова ад поспеху экіпажа». Але быць кіраўніком у спорце надзвычайна складана. Бо трэба адначасова ведаць спартыўную «кухню», быць выдатным менеджарам, дырэктарам і валодаць лідарскімі якасцямі. Усё гэта добра стасуецца з асобай прэзідэнта Беларускай федэрацыі бокса. Калісьці Дзмітрый Ціхамолаў быў паспяховым савецкім баксёрам, удзельнічаў у легендарных баях СССР — ЗША ў 1974 г., але ў алімпійскую зборную так і не трапіў. Цяпер ён марыць прывесці да алімпійскіх медалёў сваіх падапечных. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з Дзмітрыем Паўлавічам, каб даведацца, ці сапраўды суддзі прадузята ставяцца да беларускіх баксёраў, у чым сакрэт папулярнасці муай-тай і чаму прафесійны бокс падобны да шоу-бізнесу.**



## Мінскі вулкан

***— Беларускія юніёры зусім нядаўна вярнуліся з Ротэрдама, дзе праходзіў моладзевы чэмпіянат свету. Як ацэньваеце выступленне спартсменаў?***

— Тры «бронзы» і чатыры пятыя месцы — неблагія вынікі. Трэба разумець, што фактычна за два гады гэтыя 18-гадовыя байцы падужэюць і ўжо змогуць прэтэндаваць на Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанейра. Ва ўсякім выпадку, канкурэнцыя ў асноўнай камандзе будзе.

***— Пасля заканчэння чэмпіянату Еўропы па боксе, які праходзіў у Мінску, прайшло тры месяцы. З якімі эмоцыямі ўспамінаеце хатняе першынство кантынента?***

— Гэта быў сапраўдны вулкан. Яркі момант у жыцці, багаты на падзеі, прыгожыя баі, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Усе сыходзяцца на думцы, што наш чэмпіянат быў арганізаваны на вышэйшым узроўні. Напрыклад, у Ратэрдаме было шмат парушэнняў, нязручнасцяў. Гэта датычыцца і размяшчэння, і харчавання. Па апошнім увогуле шмат прэтэнзій. Ледзь не кожны дзень — макарона. А на сняданак — толькі яечня і сыр! І абмежаванні па порцыях. Баксёры хадзілі галоднымі. Хлопцы, якія зганялі вагу, аддавалі свае талоны калегам, каб тыя трохі падсілкаваліся. У нас такога не было. Ніякіх талонаў — прыходзь і еш колькі ўлезе.

## Кулуарныя гульні

**— У Мінску беларусы здабылі тры «бронзы» і адно «серабро»... якое павінна было быць «золатам». Згодны, што Вазгена Сафар'янца папросту засудзілі?**

— Адназначна, гэта быў выйграны бой. Калі дэталёва разглядаць той паядынак, то першы раўнд Вазген выйграў, другі — тактычна граматна аддаў, у трэцім барацьба была роўная. Памылка была толькі ў тым, што, аддаючы другі раўнд, ён дазволіў саперніку злавіць кураж. Няхай ты будзеш менш актыўным у атацы, але важна захоўваць ініцыятыву, асабліва ў канцы раўнда. На апошніх секундах трэба было нанесці некалькі дакладных ударaў, але Вазген гэтага не зрабіў. Яшчэ трэба ўлічваць, што суддзі назіраюць за паядынкам з розных бакоў: адзін суддзя бачыць удар, другі — не. Але самы супярэчлівы момант — выяўленне пераможца. Камп'ютар выпадковым чынам улічвае тры судзейскія рашэнні з пяці. Што гэта за праграма? Хто яе напісаў? Як яна працуе? Ніхто не ведае. Уявіце, па занатоўках суддзяў выйграе баксёр у чырвоным кутку — 3:2, а камп'ютар аддае перамогу спартсмену ў сінім кутку — 2:1. Зразумела, што такі расклад не можа нас задавальняць. Трэба пераглядаць гэту сістэму.

***— Калі параўноўваць судзейства адносна нашых спартсменаў на чэмпіянаце Еўропы і на Алімпіядзе ў Лондане, няма адчування дэжавю?***

— Абсалютна не. Мала таго, я не ўхваляю выказванні нашых баксёраў пра тое, што на сусветных і кантынентальных першынствах да Беларусі ставяцца прадузята. Некаторым проста зручна спісваць свае няўдачы на несправядлівыя судзейскія рашэнні. І патрыятызм тут зусім не пры чым. Пасля Алімпіяды не раз даводзілася чуць недарэчную здагадку, быццам Азербайджан заплаціў 12 млн долараў за залаты медаль у суперцяжкай вазе. Ну і дзе «золата»?! Мамедаў так і застаўся з «бронзай» (у баі за «бронзу» азербайджанскі баксёр Тэймур Мамедаў перамог беларуса Сяргея Карнеева. — **Аўт**.). Усё гэта кулуарныя, альбо нават калякулуарныя, гульні. Прафесіяналы гэта разумеюць і не звяртаюць увагі.

## Бізнесмен у баксёрскіх пальчатках

***— Дзмітрый Паўлавіч, вы — паспяховы бізнесмен. Выкажу здагадку, што прадпрымальніцкая дзейнасць дапамагае кіраваць федэрацыяй бокса...***

— Вы маеце рацыю. Па вялікім рахунку бокс — гэта і ёсць вытворчасць. Мы рыхтуем прафесійных баксёраў. Яны ў сваю чаргу павінны максімальна карыстацца магчымасцямі, якія прапануюць ім федэрацыя і Міністэрства спорту. Дык вось, як бізнесмен я дакладна ўяўляю — каму плаціць, каму не плаціць, колькі плаціць, якія межы вызначаць. Калі я прыйшоў на гэтую пасаду, то ўвёў рэйтынг баксёраў, які яны павінны пацвярджаць, каб атрымліваць дадатковае фінансаванне. Важна, каб спартсмены разумелі: толькі плённая праца і адпаведныя вынікі прыносяць матэрыяльны дастатак.

**Для мяне няма слова «не». А ёсць: «трэба падумаць, што можна зрабіць».**

У маладосці, калі я працаваў выкладчыкам ва ўніверсітэце, мне не хапала грошай, і я падпрацоўваў таксістам. А калі скончыў спартыўную кар'еру, быў час, калі разгружаў вагоны з соллю. Жыццё прывучыла цаніць цяжкую працу. Я вельмі хутка адрозніваю гультаёў ад працавітых спартсменаў. А гэта значна палягчае маю задачу. Падапечныя ведаюць, што для мяне няма слова «не». А ёсць «Трэба падумаць, што можна зрабіць». Таму некаторым трэнерам і кіраўнікам спартыўных ведамстваў цяжка са мной весці перамовы. Многія забываюць: акрамя таго, што я прадпрымальнік, я яшчэ і баксёр, і свой прадмет ведаю добра. Мяне вельмі складана ашукаць.

## Віск і пляскание ў Лас-Вегасе

***— Многія спартсмены пераходзяць у прафесійны бокс, цалкам не рэалізаваўшы сябе на аматарскім узроўні. Вы бачыце ў гэтым праблему?***

— Безумоўна. Але ў эліту прафесійнага бокса так ці інакш трапляюць спартсмены, якія сталі паспяховымі ў аматарах. Бо пра сур'ёзныя кантракты можа ісці гаворка толькі тады, калі ты станеш алімпійскім чэмпіёнам, чэмпіёнам свету ці хаця б чэмпіёнам Еўропы. А многія нашы баксёры (я маю на ўвазе беларускіх, расійскіх, украінскіх) чамусьці лічаць, што за мяжой яны будуць атрымліваць большыя грошы, пры гэтым не паказаўшы добрых вынікаў, выступаючы за Радзіму. Яны памыляюцца — і трапляюць у суровыя ўмовы, дзе яскрава прасочваецца тэндэнцыя: можаш — значыць будзеш зарабляць вялікія грошы, не можаш — цябе будуць выкарыстоўваць як гарматнае мяса.

***— Прафесійны бокс прыраўноўваецца ледзь не да шоу-бізнесу. Ваша стаўленне да ўсёй гэтай мішуры, якая суправаджае прафесійныя баі?***

— Давайце будзем шчырымі, бокс — гэта кроў. Як бы ні ставіліся да таго ці іншага баксёра гледачы, яны чакаюць, што паядынак скончыцца накаўтам. Гэта ж гладыятарскія баі. Цалкам перадаць гэтую надзвычайную атмасферу можа хіба толькі Las Vegas MGM Grand Arena, дзе адбываюцца так званыя «чэмпіёнскія баі». Уявіце, 25 тысяч гледачоў! І ўсе «хварэюць» за аднаго ці другога — гудзяць, свішчуць, пляскаюць у далоні і вар'яцеюць ад захаплення. Ніколі не заўважаў у гэтым чагосьці дрэннага (*задумліва*). Адкройце любы сайт, прысвечаны прафесійнаму боксу. Пачынаеш чытаць — зацягвае, забываешся на працу. Вядома, можна проста глядзець баі, ведаць імёны чэмпіёнаў, але, каб глыбока разумець бокс, трэба валодаць больш падрабязнай інфармацыяй. Напрыклад, усе ведаюць Майка Тайсана. Аднак мала хто чуў, пра яго трэнера Коста Д'амата, які адзіны, хто зразумеў, што гэты хлопец не здольны баксіраваць дванаццаць раўндаў, але за тры адарве галаву любому. Вось Д'амата і стаў мэтанакіравана рабіць з яго вельмі хуткага баксёра. Памёр трэнер, і Тайсан стаў прайграваць. Вось вам і гісторыя. І падобных у прафесійным боксе вялікае мноства.

## «Правялі эксперымент — жахнуліся»

**— Ці справядліва будзе сцвярджаць, што зараз ў Беларусі муай-тай больш папулярны за класічны бокс?**

— Думаю, так. Я ўжо не раз адзначаў, што класічны бокс пакутуе праз недастатковасць ведаў нашых трэнераў. Што казаць, калі некаторыя спецыялісты не здольны патлумачыць звычайнаму чалавеку розніцу паміж тайскім і класічным боксам.

***— Муай-тай часта называюць «крывавым спортам». Атрымліваецца, ён больш траўматычны за класічны бокс?***

— Безумоўна. Што такое муай-тай? Бі куды хочаш і як хочаш. Стукні нагой наводмаш у ніжнюю сківіцу — і гатовы. Класічны ж бокс дакладна рэгламентуе зону ўдараў — толькі корпус і ніжняя частка твару. Але ў тайскім боксе ёсць і станоўчыя моманты. Мне падабаецца яго філасофія і тое, як трэнеры яе выкладаюць. Яны шмат чытаюць, праводзяць разнастайныя рытуалы, яны вераць ва ўсё гэта! А нашы трэнеры, на жаль, мала што ведаюць пра свой від спорту. Запытай у іх, чаму лорд Байран, Джэк Лондан ці Эрнест Хемінгуэй займаліся боксам, хіба адкажуць?! А гэта гісторыя бокса. Але і з практыкай ёсць каласальныя праблемы. Аднойчы ў нас праводзіў семінар вядомы расійскі спецыяліст Васіль Філімонаў, які чытае лекцыі ў Міжнароднай акадэміі бокса. Мы папрасілі яго правесці невялікі эксперымент. Васіль Іванавіч даў заданне ўдзельнікам семінара — прадэманстраваць на баксёрах практыкаванні для адпрацоўкі пэўных дзеянняў. Гэта быў жах! Трэнеры элементарна не ведалі, як паставіць удар, як павінны стаяць ногі і куды трэба пераносіць вагу цела. А яны ж атрымалі вышэйшую спартыўную адукацыю! Значыць, такія патрабаванні былі да залікаў і іспытаў. Таму цяпер мы актыўна ўзаемадзейнічаем з універсітэтам фізкультуры: уносім пэўныя змены ў вучэбную праграму. Мая думка — трэба рабіць больш жорсткімі патрабаванні да абітурыентаў. Падрыхтоўка трэнерскіх кадраў не павінна быць канвеерам.

## Іншапланецяне з СССР

**— Дзмітрый Паўлавіч, можаце ўспомніць свае першыя ўражанні, калі трапілі ў ЗША ў складзе савецкай зборнай па боксе?**

— Вядома, тады мы ўспрымалі гэту краіну як іншасвет. У сваю чаргу амерыканцы таксама прымалі нас ледзь не за іншапланецян. Усе ведалі абрэвіятуру з назвай нашай краіны, якую можна было пабачыць у нас на спартыўных касцюмах, падыходзілі, пыталіся пра Савецкі Саюз. Бо ўсе веды пра СССР у мясцовых жыхароў зводзіліся да Чайкоўскага, Дастаеўскага, Масквы і мядзведзяў. Тое, што ў Савецкі Саюз уваходзіць 15 рэспублік, тое, што ў нас ёсць чыгунка, аўтамабільныя магістралі, тое, што мы таксама слухаем амерыканскую музыку і чытаем амерыканскіх пісьменнікаў, — усё гэта трэба было тлумачыць. Дарэчы, час ад часу мне і цяпер даводзіцца тлумачыць замежнікам, з якой я краіны. Гадоў дзесяць таму зноў-такі ў ЗША быў забаўны выпадак. Да мяне падышоў цёмнаскуры хлопец і запытаўся, дзе знаходзіцца Беларусь. Я намаляваў яму карту, дзе пазначыў суседнія краіны — Польшчу, Расію... Ён доўга ўглядваўся ў малюнак, намагаўся нешта зразумець, а потым спытаў: «У вас ёсць такія, як я, — цёмнаскурыя?». Я кажу: «Так. І нават маленькія дзеткі». На што ён робіць характэрны жэст і кажа: «Класная краіна!» (*смяецца*).

***— Вас часта параўноўваюць з вядомым амерыканскім рэстлерам і акцёрам Халкам Хоганам. Адкуль узяўся такі незвычайны імідж?***

— Гэта вельмі забаўная гісторыя (*смяецца*). Аднойчы на вечарынцы сябры параўналі мяне з Халкам Хоганам. І яшчэ дадалі: «А былі б у цябе больш доўгія валасы і пышныя вусы — зусім адзін твар!». У выніку з мяне ўзялі абяцанне адрасціць валасы і вусы. Адрасціў, надзеў бандану, сфатаграфаваўся. Калі побач пакласці два здымкі — мой і амерыканца, то, здаецца, не вельмі



...А гэта — Халк Хоган.

падобны, а калі паасобку, пэўнае падабенства ёсць. А потым мяне пачалі блытаць з Хоганам. Аднойчы ў Маскве да мяне падышоў хлопец і пачаў размаўляць па-англійску, называючы мяне Халкам. Я падыграў, сказаў, што яго брат. Але самы адметны выпадак здарыўся ў Берліне. Наведваў бой Клічко. Стаю на чырвонай дарожцы, чакаю сяброў, навокал — папарацы, «зоркі» шоу-бізнесу і спорту. І тут пад'язджае Міхаэль Шумахер. Падбягае, ляпае па плячы і кажа: «Прывітанне, Халк. Як справы?». Здзіўлена адказваю: «Нармальна». Ён: «Ну, добра. Паразмаўляем яшчэ падчас бою» (*смяецца*).

***— Як трымаеце сябе ў тонусе?***

— Кожную раніцу мінімум паўгадзіны раблю зарадку. Акрамя гэтага, некалькі разоў на тыдзень дазваляю сабе больш сур'ёзныя нагрузкі — практыкаванні з баксёрскім мяшком ці актыўныя прагулкі з сабакамі. У мяне дзве сярэднеазіяцкія аўчаркі, альбо, па-навуковаму, алабаі. Вельмі добрыя ахоўнікі і напарнікі па прабежцы (*усміхаецца*). Увогуле я не дрыжу над сваім здароўем. Вядома, думаю пра пэўныя абмежаванні ў харчаванні, фізічныя нагрузкі, адпачынак... Але насамрэч думаць трэба менш. Нядаўна ўнучка раніцай папрасіла мяне забраць яе з дзіцячага садка. Я адказаў ёй: «Шмат працы. Я падумаю». На што пачуў геніяльны па сваёй мудрасці адказ: «А ты не думай — забяры».

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

■ Кватэрнае пытанне

# НА САЦЫЯЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ ПРЭТЭНДАВАЦЬ МОЖНА...

***Наша сям'я (бацькі-пенсіянеры, сын, нявестка і ўнук) з 2000 года стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На будаўніцтва новай кватэры, нават з крэдытам, сродкаў няма. Ці ёсць выйсце? Ці могуць бацькам, напрыклад, выдзеліць сацыяльнае жыллё?***

**С. Федаровіч,** *г. Ліда.*

У адпаведнасці з арт. 111 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь права на атрыманне ў вызначаным парадку жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання маюць як асобныя катэгорыі грамадзян незалежна ад даходу ў іх сем'ях і маёмаснага стану (напрыклад, ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, грамадзяне, у складзе сем'яў якіх маюцца дзеці-інваліды, дзеці-сіроты, непрацуючыя адзінокія пенсіянеры і асобы, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, некаторыя іншыя), так і катэгорыі грамадзян, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае зацверджанага бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, падлічанага за 12 месяцаў, якія папярэднічалі месяцу пастаноўкі на ўлік (і на дзень выдзялення жылога памяшкання сацыяльнага карыстання) і якія валодаюць заяўленай маёмасцю, агульны кошт якой не перавышае памеру кошту кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў, зыходзячы з максімальнай нормы прадастаўлення агульнай плошчы жылога памяшкання сацыяльнага карыстання на аднаго члена сям'і (20 кв. метраў). Да апошніх аднесены і пенсіянеры, асобы, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў).

Такім чынам, калі ў гэтай сям'і пенсіянераў згаданы даход не перавышае адпаведную велічыню бюджэту пражытковага мінімуму (пастановай Савета Міністраў ад 26 ліпеня 2013 г. № 659 БПМ вызначаны ў памеры 1026290 рублёў на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2013 г.), то яна можа прэтэндаваць на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання ў парадку чарговасці.

**Віктар САВІЦКІ**

■ Ліставанне

# «ЗВЯЗДА» ПА-РУСКУ — ГЭТА...

***«Уважаемая редакция! Я давно люблю вашу газету. И очень хотела бы читать ее на русском языке. Журналисты же могут писать свои статьи в двух вариантах?***

***Ответьте, пожалуйста, на мое письмо.***

**Тамара Л., г. Минск**

**Ад рэдакцыі.** Кароткі ліст і, як быццам, просты (калі, зразумела, не ўчытвацца ў кожнае слова)...

Акурат такі ж можна напісаць і адказ. Кшталту: зарэгістравана «Звязда» як выданне на беларускай мове; заснавальнікамі з'яўляюцца Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Палата прадстаўнікоў і Савет Міністраў краіны. Так што выпуск двух тыражоў — асобна на першай дзяржаўнай мове, асобна на другой, як той казаў, не ў нашай кампетэнцыі...

Аднак аўтар, напэўна ж, чакае іншых слоў.

Па-першае, дзякуй вам, спадарыня Тамара, за тое, што напісалі, дзякуй за досыць высокую ацэнку працы калектыву: сам зварот «уважаемая редакция» і прызнанне «любимая газета» дарагога каштуюць. Хоць і супярэчаць крыху далейшаму зместу ліста, бо газету, якую цяжка чытаць (а тым больш з-за мовы!), палюбіць складана. Калі наогул магчыма.

Аднак дапусцім, што гэта сталася: падабаецца газета формай падачы матэрыялаў, знешнім выглядам, зместам, ёсць любімыя рубрыкі, аўтары... Але хочацца чытаць іх, як пішаце, «на русском»?

Зразумелае жаданне, бо так і насамрэч прасцей, лягчэй — для тых, хто беларускай не ведае і ведаць не хоча.

Але ж гэта, як трэба разумець, не пра вас? Вы, жывучы ў Беларусі, палічылі патрэбным вывучыць мову карэннага насельніцтва і ўжо чытаеце на ёй. Дык ці варта адступаць? «Звязда», прыходзячы да вас па-ранейшаму (па-беларуску), дапаможа ўдасканаліць веды, каб вы змаглі атрымаць сапраўдную асалоду ад «Кургана» Купалы і «Новай зямлі» Коласа , ад «Ладдзі роспачы» Караткевіча і безлічы іншых твораў (на мове арыгінала!), дапаможа навучыцца размаўляць. А што ўмееш, як вядома, за плячыма не носіш...

Так, журналісты «Звязды» і насамрэч могуць і ўмеюць пісаць па-руску. Да таго ж у рэдакцыі ёсць перакладчыкі... Аднак пайсці насустрач вашай просьбе...

Сапраўды, большасць жыхароў нашай краіны — так, на жаль склалася — размаўляюць па-руску. Але далёка не кожны з тых «говорящих» хацеў бы менавіта па-руску і чытаць. Да таго ж — менавіта «Звязду». Па-другое, выпуск двух тыражоў — гэта, па сутнасці, выпуск дзвюх газет з усімі адсюль выдаткамі, для газеты непад'ёмнымі і, бяромся сцвярджаць, непатрэбнымі, бо «Звязда» па-руску — гэта — нонсэнс (бяссэнсіца, недарэчнасць), крок назад, бо ў гісторыі беларускай журналістыкі прэцэдэнты былі: двума тыражамі (асобна — на беларускай мове, асобна — на рускай) у розныя часы газеты выходзілі... У гісторыі «Звязды» такога не было; яна адзіная са штодзённых газет ужо амаль сто гадоў выходзіць на першай дзяржаўнай мове... Што набудзе з выпускам накладу яшчэ і на другой? Ёсць, як той казаў, пытанне. Што страціць — для нас, прынамсі, — пытанняў няма.

Для чытачоў, якія атрымалі газету ў спадчыну, якія гадамі, дзесяцігоддзямі сябруюць з ёй, спадзяёмся, таксама.

**Валянціна ДОЎНАР**

■ Была вайна

# ШЭНЬКА

**Мая вёска Доўгавічы, што на Мсціслаўшчыне, перад пачаткам Вялікай Айчыннай выглядала так: адзінаццаць пасёлкаў, размешчаных з абодвух бакоў шляху, у кожным — не менш як дваццаць гаспадарак і, вядома ж, гаспадароў. Яны былі рознымі. Прынамсі, ідучы паўз дом, дзе жыў млынар, мы, малыя, стараліся папужаць яго: схавацца дзе-небудзь за плот і адтуль кінуць каменьчыкам або крыкнуць: «Шэнька, мы цябе не баімся!» Шэнька адкрыта недалюбліваў бацьку. Бацька на гэта не звяртаў увагі.**

...Вайна пачалася нечакана. Мы з суседкай Таняй, старэйшай за мяне на два гады, гулялі пад павеццю ў лялькі, калі з-за лесу вылецелі самалёты і пачалі бамбіць машыны, якія ішлі па шляху. Разам з дарослымі мы пабеглі хавацца да рэчкі, пад яе берагі.

Пасля бамбёжкі самалёты назад не вярнуліся, а мы з суседзямі аж да самага вечара вяртацца ў хаты.

Праз якія суткі ці двое жыхары нашай вуліцы прынеслі навіну: «Нашы адступаюць». З боку ракі Кашанкі, праз луг, проста на агароды беглі салдаты. Я ўпершыню ўбачыла мужчын, апранутых у гімнасцёркі. Людзі ж старэйшыя здзіўляліся, што не ўсе вайскоўцы ўзброены.

Праз некаторы час на вуліцы з'явіліся немцы, увайшлі ў наш двор. «Матка, яйкі!» — запатрабаваў адзін. Мама вынесла кошык... Другі ж немец пайшоў у пуню, сам палез у курыныя гнёзды. Спуджаныя куры з кудахтаннем забегалі па агародзе.

Так пачалося жыццё ў нямецкай акупацыі. Праўда, самі немцы ў вёску наведваліся рэдка, а вось чутак аб тым, што фарміруюцца атрады партызан, хадзіла ўсё больш і больш.

...У той дзень зранку бацька запрог кабылу, каб абагнаць бульбу. Мы ўсёй сям'ёй пайшлі яе аглядаць, абрываць пустазелле. І, калі разагнулі спіны, замерлі на месцах: па шляху ішоў пешы атрад узброеных партызан. Ішлі яны павольна, некаторыя апусціўшы галовы — відаць было, што вельмі стомленыя.

Да бацькі падышоў сусед, і яны аб нечым ціха размаўлялі. Я неўпрыкмет падышла, прытулілася да бацькі і пачула, як ён казаў суседу, што дапамагчы партызанам немагчыма, бо з усіх бакоў карнікі. «Прыйдзецца ім прымаць бой... Можа, хто-небудзь і выжыве... Трэба папярэдзіць жанчын, каб пабралі дзяцей і пакінулі пасёлак».

Бацька загадаў нам аглядаць бульбу, потым вячэраць і класціся спаць, яго не чакаючы. Лёгка сказаць... Я адчувала, што маці не спіць, пыталася ў яе, куды пайшлі партызаны і чаму так доўга няма таты, дзе ён. «Мабыць, пайшоў за хутар шукаць кабылу, бо на лужку яе не відаць. І чаму мы яе ў хлеў не загналі?» — клапацілася мама.

Бацька ж, вяртаючыся дадому, таксама заўважыў, што кабылы няма. Узяў нейкі кіёк і накіраваўся ў бок хутара, калі пачуў: «Партизан, бросай оружие!». Бацька ўзняў рукі і таксама гучна адказаў: «Гэта кіёк, я па кабылу іду». Але да яго ўжо падбеглі двое ў нямецкай форме і загадалі ісці да млына. Бацька спалохаўся, пачаў тлумачыць, хто ён і чаго тут ходзіць, але карнікі яго не слухалі: дуламі аўтаматаў пхалі ў спіну ў бок млына.

— Это ваш человек? — спыталі ў млынара.

— А як жа! Наш! — кінуўся насустрач Шэнька.

Бацька стаяў нерухома і ніяк не мог зразумець, што адбываецца: яны з Шэнькай ніколі не былі ворагамі, але і не былі сябрамі. Таму ён ніколі не чакаў такіх слоў і такіх паводзін.

Шэнька ж запрасіў тату ў млын, прынёс бутэльку, сказаў: «Вып'ем за перамогу!». Бацька не без сумнення спытаў: «За якую? На каго ты працуеш? На немцаў? Можа, і мяне хочаш далучыць? То лепш прынясі вялізны камень».

Кандратавіч заўсміхаўся, замест каменя ён прынёс бярэмя дроў. Яны распалілі касцёр.

Млынар, як высветлілася, не служыў немцам: ім патрэбна была мука, яму — жыццё.

Тату ён выдаў за свайго памочніка... І тым самым выратаваў ад смерці. Потым яны разам дапамагалі партызанам. І ўжо не баяліся адзін аднаго.

**Вера САЗОНАВА,** *г. Мінск*

■ Інфарм-укол

# ЯК ХАРЧАВАЦЦА ХВОРЫМ НА ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ?

**Лячэнне аднаго з самых распаўсюджаных захворванняў эндакрыннай сістэмы нашага арганізма прадугледжвае пэўны лад жыцця. Правільны лад жыцця, асабліва для людзей з цукровым дыябетам 2 тыпу, кампенсуе захворванне. Спрыяюць гэтаму дазаваныя фізічныя нагрузкі, спецыяльная дыета, кантроль узроўню глюкозы ў крыві і своечасовая карэкцыя лячэння.**

Паводле слоў **інструктара-валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірыны ШЫМАНСКАЙ,** ва многіх выпадках адна толькі дыета спрыяе аднаўленню нармальнага ўзроўню цукру ў крыві.

Як вядома, пры цукровым дыябеце ў асноўным парушаны вугляводны абмен. Аднаўленне гэтага абмену дасягаецца двума шляхамі: шляхам забеспячэння клетак інсулінам і шляхам забеспячэння раўнамернага паступлення вугляводаў у арганізм.

**АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ДЫЕТЫ**

♦абмежаванне вугляводаў, выдаленне з рацыёну або мінімальнае ўжыванне цукру, шакаладу, цукерак, кандытарскіх вырабаў, варэння, марожанага і інш.;

♦рэжым харчавання (5-6 разоў на суткі);

♦наяўнасць у прадуктах дастатковай колькасці вітамінаў;

♦зніжэнне каларыйнасці ежы;

♦уключэнне ў рацыён малака і малочных прадуктаў.

**ШТО ТАКОЕ «ХЛЕБНАЯ АДЗІНКА»?**

Такое паняцце дыетолагі ўвялі для разліку колькасці прадуктаў, якія змяшчаюць пэўную колькасць вугляводаў (глюкозы, цукру). Незалежна ад віду прадукту, адна хлебная адзінка прадукту змяшчае 15 г засваяльных вугляводаў.

Сутачная патрэба дарослага чалавека ў вугляводах складае 18-25 хлебных адзінак. Большая частка вугляводаў павінна прыпадаць на першую палову дня. Правільны падлік вугляводаў у ежы ў «хлебных адзінках» і прыём адпаведнай колькасці інсуліну імітуюць нармальную дзейнасць падстраўнікавай залозы, якая выпрацоўвае ў здаровых людзей тую колькасць інсуліну, якая неабходна для засваення ўсіх вугляводаў.

**1 хлебнай адзінцы адпавядае:**

кавалачак хлеба (25-30 г)

1 ст. л. мукі або крухмалу

2 ст. л. любых вараных круп

1 шклянка малака

1 ст. л. цукру-пяску

2,5 кубіка цукру-рафінаду

1 бульбіна сярэдняй велічыні

1 буйны бурак

3-4 вінаградзіны

палова грэйпфрута, банана, пачатак кукурузы

1 яблык, 1 груша, 1 персік, 1 апельсін, 1 хурма, 1 кавалак дыні/кавуна

3-4 сярэднія мандарыны, абрыкосы або слівы

кубак малін, суніц, чарніц, парэчак, брусніц, ажын

1/3 шклянкі вінаграднага соку

1/2 шклянкі яблычнага соку

1 шклянка квасу або піва

Мясныя і рыбныя прадукты не змяшчаюць вугляводаў і не маюць патрэбы ва ўліку, паколькі ў іх нязначная колькасць вугляводаў.

Не рэкамендуецца ўжываць прадукты з вялікай колькасцю лёгказасваяльных вугляводаў: цукеркі, разынкі, інжыр. Неабходна сур'ёзна абмежаваць смажаныя, вострыя, салёныя і вэнджаныя стравы. Зусім не пажаданыя для такіх хворых прадукты, якія змяшчаюць адначасова шмат і вугляводаў, і тлушчаў: шакалад, марожанае, торты.

Калорыі: пры росце 160-175 см неабходна 1600-2500 ккал на дзень у залежнасці ад фізічнай нагрузкі. Калі ёсць лішняя вага, значыць, колькасць калорый павінна быць малой.

Бялок павінен складаць 20 працэнтаў ежы. У норме чалавеку неабходна 60-80 г бялкоў, хвораму на цукровы дыябет — 40-50 г.

Тлушчы складаюць 30 працэнтаў ежы (з іх 10 працэнтаў — жывёльныя, 90 працэнтаў — алеі).

Вугляводы павінны складаць 50-60 працэнтаў ежы. Уся гародніна (бульбу абмяжоўваць), садавіна, ягады, малако, крупы, жытні хлеб.

Рацыён павінен быць разнастайным. Можна ладзіць «малочныя», «гароднінныя», «мясныя», «рыбныя» дні.

Для навучання новаму ладу жыцця распрацаваны спецыяльныя праграмы, з якімі можна азнаёміцца ў школе цукровага дыябету. Прайсці падрыхтоўку ў такой школе павінен кожны хворы. Распытайце пра гэта свайго ўрача.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

Віншую **калектыў Астрамечаўскай сярэдняй школы, чытачоў сельскай бібліятэкі імя Ф.Ф. Паўленкава**, а таксама ўсіх **вяскоўцаў** з Днём ведаў. Жадаю яшчэ мацней сябраваць з кнігай, сапраўднага чалавечага шчасця, сонечных сцежак у жыцці.

**Аляксей СКАКУН, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь.**

УНП 200035478





*На вясковай вуліцы свята: паспяхова завершана жніво, наперадзе — новы навучальны год. Ад шчырага сэрца віншую з гэтымі ўрачыстымі падзеямі ўсіх хлебаробаў, настаўнікаў, ветэранаў вайны і працы, нашых імяніннікаў, якія нарадзіліся на зыходзе лета. Жадаю жыхарам аграгарадка Дварэц, навакольных палескіх вёсак былога калгаса імя Жданава сонечнага святочнага настрою, важкіх караваяў і звонкіх песняў у час сямейных застолляў, моцнага здароўя і шчодрага даўгалецця пад мірным небам.*

**З павагай,**

**Анатоль Уладзіміравіч КІНДРУК, старшыня праўлення СВК «Дварэцкі» Лунінецкага раёна.**

*УНП 200173013*

■ Час наспеў

# ЗАКОН ЗАБАРОНІЦЬ ПАДЛЕТКАМ ШКОДНЫЯ ПРЫХІЛЬНАСЦІ

**За апошнія 10 гадоў падлеткавая злачыннасць знізілася амаль на 35 працэнтаў. Галоўным чынам няпоўнагадовыя ўчыняюць крадзяжы. Аднак усё часцей яны пачалі здзяйсняць злачынствы, на якія раней ішлі толькі дарослыя. Гэта незаконныя дзеянні ў дачыненні да зброі і наркотыкаў, а таксама злачынствы ў галіне высокіх тэхналогій.**

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, негатыўныя фактары ў сямейнай галіне — галоўная прычына крымінальных паводзін няпоўнагадовых. Сёлета выяўлена амаль 8 тысяч падлеткаў, якія пражываюць і выхоўваюцца ў неспрыяльных умовах. Праблемы алкагалізацыі і наркатызацыі ў моладзевым асяродку толькі абвастраюцца. Пры гэтым назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да амаладжэння спажыўцоў спіртнога і наркотыкаў. За парушэнне антыалкагольнага заканадаўства сёлета зафіксавана амаль 5 тысяч няпоўнагадовых. Яшчэ 3,5 тысячы дарослых набывалі ім алкагольныя напоі або ўцягвалі ва ўжыванне, а 809 прадаўцоў рэалізавалі спіртное падлеткам.

МУС прапануе прадугледзець у Законе «Аб правах дзіцяці» норму, якая б забараняла асобам ва ўзросце да 18 гадоў курыць, ужываць алкагольныя і слабаалкагольныя напоі, наркотыкі, псіхатропныя рэчывы і аналагі, а ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях увесці адказнасць бацькоў за такія дзеянні дзяцей. Прапануецца замацаваць на заканадаўчым узроўні правядзенне абавязковага тэсціравання навучэнцаў устаноў адукацыі на ўжыванне алкаголю і наркотыкаў. У Міністэрстве ўнутраных спраў робяць акцэнт на тым, каб не дапусціць фармалізму ў падобных пытаннях і сур'ёзна аналізаваць прычыны яго ўзнікнення.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Навіны падземкі

# МЕТРАПАЛІТЭН: АЎТАМАТЫЧНА, АЛЕ ПАД НАГЛЯДАМ...

**Менавіта так будуць працаваць цягнікі на трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна, першыя чатыры станцыі якой плануюць адкрыць у 2017 годзе.**

Пра гэта паведаміў **начальнік камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн» Расціслаў Юрэня:**

— Мы не гатовы зрабіць так, як, напрыклад, у метро Тулузы, дзе цягнікі рухаюцца ўвогуле без машыністаў. За механізмам, які працуе аўтаматычна, усё роўна павінен нехта назіраць. Так што машыністы на новай лініі будуць выконваць пасіўныя функцыі, знаходзячыся ў кабінах, — адзначыў Расціслаў Юрэня.

Акрамя таго, на станцыях трэцяй лініі з'явяцца платформенныя дзверы. Дзякуючы ім пасажыры будуць абаронены як ад выпадковага, так і ад наўмыснага падзення на рэйкі. Расціслаў Юрэня дадаў, што летась у мінскай «падземцы» чатыры чалавекі спрабавалі скончыць жыццё самагубствам, скочыўшы на пуці.

Сёння сабекошт праезду аднаго пасажыра ў сталічнай падземцы крыху больш за 4 тысячы рублёў. Але інфармацыі пра павелічэнне кошту пакуль не прагучала, як не пачулі журналісты і пра адкрыццё станцыі «Малінаўка»:

— Мы чакаем увядзення ў эксплуатацыю станцыі «Малінаўка». Думаю, гэты раён дасць нам яшчэ адно павелічэнне ліку пасажыраў. Пра тэрмін адкрыцця, на жаль, нічога сказаць не магу, паколькі адказваю толькі за дзейны метрапалітэн, — паведаміў Расціслаў Юрэня.

Цяпер першае месца па прыёме пасажыраў займае станцыя «Плошча Леніна», наступная пасля яе — «Каменная Горка», а самыя «разгружаныя» станцыі — «Першамайская» і «Маладзёжная».

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■

# КІРАЎНІКОЎ І СЛУЖАЧЫХ У ВНУ ПЕРАЛІЧАЦЬ...

**Для беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі ўпершыню зацверджаны тыпавыя штаты.**

Пастанова Міністэрства адукацыі ўстанаўлівае нарматывы колькасці работнікаў, якія адносяцца да катэгорыі кіраўнікоў, спецыялістаў і іншых служачых, і не закранае прафесарска-выкладчыцкі састаў ВНУ, загадчыкаў кафедраў, работнікаў інтэрнатаў і структурных падраздзяленняў, створаных для правядзення практыкі або прызначаных для іншых мэт адукацыйнага працэсу: маюцца на ўвазе вучэбныя палігоны, аўтадромы і г.д.

Штатная колькасць служачых ВНУ будзе вызначацца, зыходзячы з канкрэтнай колькасці студэнтаў у кожнай ВНУ і ўстаноўленага нарматыву. Для тэхнічных спецыяльнасцяў гэты нарматыў складае 8,5 студэнта на аднаго работніка ВНУ, а на гуманітарных спецыяльнасцях — 12 студэнтаў на аднаго работніка.

— Дыферэнцаваны падыход у вызначэнні суадносін колькасці студэнтаў да колькасці работнікаў ВНУ тлумачыцца рознымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры навучанні па тэхнічных і гуманітарных спецыяльнасцях, — патлумачылі ў Міністэрстве адукацыі. — Калі пры навучанні студэнтаў па тэхнічных спецыяльнасцях патрабуецца наяўнасць вучэбна-вытворчых майстэрняў, лабараторый, аснашчаных складанай тэхнікай, станкамі і абсталяваннем, то пры навучанні на гуманітарных спецыяльнасцях дастаткова, як правіла, камп'ютарнай тэхнікі.

Нарматыў не будзе распаўсюджвацца таксама на структурныя падраздзяленні, створаныя ў ВНУ для выканання навуковых даследаванняў, якія атрымалі пасведчанне аб акрэдытацыі навуковай арганізацыі, і работнікаў фізкультурна-спартыўных збудаванняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Дзе вас чакаюць

# АТРЫМАЦЬ РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА...

**Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, у 162 установах прафтэхадукацыі (гэта 80% ад агульнай колькасці) падоўжаны прыём дакументаў ад абітурыентаў. Дакументы будуць прымацца да поўнага ўкамплектавання вучэбных груп, але не пазней чым да 15 верасня. Маладых людзей чакаюць у прафтэхустановах, якія рыхтуюць кадры для лёгкай прамысловасці, машынабудавання, сельскай гаспадаркі і будаўніцтва.**

На працягу апошніх гадоў назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці выпускнікоў дзявятых класаў, якія вырашылі працягнуць вучобу у 10-м класе, і змяншэнне колькасці тых, хто выбірае пасля заканчэння сярэдняй школы прафесійна-тэхнічныя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Традыцыйна папулярнасцю ў абітурыентаў карыстаюцца прафесіі вадзіцеля аўтамабіля, аўтаслесара, правадніка, памочніка машыніста, абліцоўшчыка-плітачніка, цырульніка, а таксама іншыя прафесіі сферы бытавога абслугоўвання. А вось з камплектаваннем дэфіцытных для рынку працы прафесій будаўнічага і сельскагаспадарчага профіляў звычайна ўзнікаюць праблемы.

Асобы, якія паступаюць у прафесійна-тэхнічныя ўстановы, мусяць падаць у прыёмную камісію наступныя дакументы: заяву на імя кіраўніка, арыгіналы дакумента аб адукацыі, медыцынскую даведку аб стане здароўя, дакументы, якія пацвярджаюць іх права на льготы, 6 фотаздымкаў памерам 3 х 4 см і дакумент, які сведчыць іх асобу (для непаўналетніх такім дакументам з'яўляецца пасведчанне аб нараджэнні).

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Будзь у тэме!

# ЭКАЎРБАНІСТ І СІЦІ-ФЕРМЕР — ПРАФЕСІІ БУДУЧЫНІ

Маскоўская школа кіравання «Сколкава» сумесна з Агенцтвам стратэгічных ініцыятыў падрыхтавала атлас 100 новых і 30 знікаючых прафесій. Згодна з ім, да 2020 года знікнуць такія прафесіі, як дыягност, стэнаграфіст, турагент, швачка, ліфцёр, паштальён. Пасля 2020 года не застанецца журналістаў, юрысконсультантаў, натарыусаў, правізараў, аналітыкаў, банкаўскіх работнікаў, лагістаў, лектараў. На змену ім прыйдуць сіці-фермеры, экаурбаністы, біятрансдуктары, тайм-брокеры, ГМА-аграномы і іншыя спецыялісты будучыні.

Аднак не ўсе эксперты рынку працы згодны з такім прагнозам. На іх думку, малаверагодна, што ў хуткім часе раптам узрасце попыт на «дызайнераў віртуальнага свету» ці «інжынераў-касмадарожнікаў». Яшчэ больш малаверагодна, што ў сучасным свеце раптам будуць вельмі запатрабаваны спецыялісты ў вобласці «карпаратыўнай антрапалогіі» ці «тайм-брокерства».

Па словах рэкруцёраў, сёння ў большай ступені назіраецца тэндэнцыя да ўзрастання попыту на «шматфункцыянальных» спецыялістаў, якія валодаюць кваліфікацыяй адразу ў некалькіх прафесійных галінах: напрыклад, юрыст-эканаміст, фармацэўт-маркетолаг, натарыус-перакладчык.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Пераможцы

# ЛЕПШЫЯ ПАШТАВІКІ

У Брэсце прайшоў сямнаццаты абласны конкурс прафесійнага майстэрства сярод аператараў паштовай сувязі і паштальёнаў. Удзельнікі спаборніцтваў адказвалі на пытанні, выконвалі практычныя заданні, паказвалі падрыхтаваныя прэзентацыі па зададзеных тэмах. Па выніках конкурсу лепшымі аператарамі сувязі сталі Наталля Рудзяк і Юлія Тукала з Брэста, трэцяе месца заняла Ірына Мрочка з Маларыты. Сярод паштальёнаў прызавыя месцы занялі адпаведна: Святлана Гаховіч з Баранавічаў, Наталля Кульчынская з вёскі Дывін Кобрынскага раёна, Наталля Сукач з Абяроўшчыны Камянецкага раёна.

**Яна СВЕТАВА.**

*Брэстчына*

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 сентября 2013 г. АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА ЛОГИСТИЧЕСКОГО ЦЕНТРА В БРЕСТСКОМ РАЙОНЕ

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Стоимость, руб. | Целевое назначение земельного участка, его кадастровый номер, ограничения в использовании земель, срок аренды |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Район д. Дружба** | 2,9995 | | Строительство логистического центра; № 121200000001001573; срок аренды 99 лет |
| | Начальная (стартовая) стоимость; | | 209724612 | |
| | сумма задатка; | | 20972461 | |
| | расходы на изготовление земельно-кадастровой документации; | | 2342508 | |
| | расходы на организацию и проведение аукциона; | | ориентировочно: 2000000 | |
| | возмещение потерь сельскохозяйственного производства; | | 125175400 | |
| | убытки ОАО «Агро-сад Рассвет» | | 4637486 | |

**Аукцион будет проводиться 30.09.2013 в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 2 (здание райисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать: заявление об участии в аукционе; копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет финансового отдела Брестского райисполкома № 3602213000245, филиал № 100, Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200035889, код платежа 04002, залога в размере 10% от начальной цены земельного участка; копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица, индивидуального предпринимателя.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 2, каб. 52 (здание райисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 24 сентября 2013 года до 17.00.**

**Контактные телефоны: 23 63 13, 23 99 01.**

БЕЛАРУСБАНК

**Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 30 августа 2013 года поощрительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Сберегательный»** – в размере 10% годовых;
- **«Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере 9% годовых;
- **«Премиально-накопительный «Детский»** – в размере 7,5% годовых;
- **«Классик плюс»** – в размере 5,7% годовых,
- **Накопительный** – в размере 5% годовых.

Начисление поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 30.08.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 26.09.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного процентного дохода производится 27.09.2013.

При этом поощрительный процентный доход не выплачивается:

- в случае если в период с 30.08.2013 по 26.09.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 г.) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода, или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 30.08.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Классик плюс», срок возврата которых наступил до 30.08.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного процентного дохода производится с 27.09.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях Беларусбанка**

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска» (информация о застройщике и проекте строительства)

**Застройщик** – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

**Режим работы** – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) жилой дом № 70 по ул. Одоевского;
2) жилой дом № 99В по ул. М. Лынькова;
3) жилой дом № 5 по ул. Карского;
4) жилой дом № 3 по ул. Карского;
5) жилой дом № 2 по ул. Ю. Семеняко;
6) жилой дом № 26 по ул. Ю. Семеняко;
7) жилой дом № 28 по ул. Ю. Семеняко;
8) жилой дом № 30 по ул. Ю. Семеняко;
9) жилой дом № 14 по ул. Ю. Семеняко;
10) жилой дом № 22 по ул. Ю. Семеняко;
11) жилой дом № 24 по ул. Ю. Семеняко;
12) жилой дом № 3 по ул. К. Т. Киреенко;
13) жилой дом № 3 по ул. С. К. Тимошенко;
14) жилой дом № 4 по ул. Ю. Семеняко.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 24.06.2009 г.;
- экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 29.04.2013 № 266-15/13, от 18.07.2013. № 549-15/13;
- решение Мингорисполкома от 25.07.2013 г. № 1871 о разрешении строительства;
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 16.08.2013 г. № 2-208Ж-045/15;
- договор строительного подряда от 31 июля 2013 г. № 2/07 с ОАО «МАПИД» в качестве генерального подрядчика.

**Информация о проекте:**

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Десятиэтажный крупнопанельный жилой дом на 78 квартир состоит из двух секций М464М с теплым чердаком, техподпольем, остекленными лоджиями со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже. План дома прямоугольный с размерами в крайних осях 56,80х15,60 м. Высота этажа 2,8 (от пола до пола). В объеме технического подполья предусмотрены технические помещения для инженерного обслуживания здания – тепловые пункты. На первом этаже дома с отдельным входом снаружи запроектирована электрощитовая.

Каждая секция жилого дома оборудована мусоропроводом и пассажирским лифтом грузоподъемностью 630 кг. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные балконы). В квартирах, расположенных на 6-10 этажах, в качестве второго эвакуационного выхода приняты эвакуационные люки на лоджиях. Решение фасадов жилой части основано на сочетании элементов эркеров со ступенчатой структурой плоскостей стен, что подчеркивается цветовым решением фасадов.

Наружная отделка: стены – акриловые фасадные краски, покрытые фактурным защитно-декоративным полимерным составом; окна – деревянные с двухкамерным стеклопакетом; двери – по СТБ 1138-98.

Внутренняя отделка: стены – оклейка обоями, улучшенная окраска акриловыми влагостойкими красками; полы – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, керамическая неглазурованная плитка, мозаичный, бетонный. Потолки – акриловая покраска, обои.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 56 квартир:

13 однокомнатных квартир (площадь квартиры – 52,25 кв. м);

20 двухкомнатных квартир, в том числе 7 квартир (площадь квартиры – 80,43 кв. м), 6 квартир (площадь квартиры – 68,43 кв. м), 6 квартир (площадь квартиры – 74,81 кв. м), 1 квартира площадью 66,69 кв. м;

22 трехкомнатные квартиры, в том числе 1 квартира площадью 93,33 кв. м, 13 квартир (площадь квартиры – 89,57 кв. м), 8 квартир (площадь квартиры – 93,01 кв. м);

1 четырехкомнатная квартира площадью 121,23 кв. метра.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в жилом доме № 18 по генплану на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов по состоянию на февраль 2014 года и составляет 13 460 200 рублей.

Начало строительства – август 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – май 2014 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**<u>12 сентября 2013 года</u> проводит 9-ый от 30.04.2013, 13-ый от 11.07.2013 и <u>16-ый</u> от 28.08.2013 повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 334 | Мастерская ПМ-2-70 № Л351022 1980 г. 4 кат. в составе: -МРМ-М1 № 123 на ЗИЛ-131 1980 г. ш. 352538 дв. 929015 -МРС-АР № 79073 на ЗИЛ-131 1979 г. ш. 338958 дв. 857315 -ТА-5 № Л351022 на ЗИЛ-131 1980 г. ш. 381742 дв. 075143 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № Б32365517 на пр.1-П-1,5 1977 г. ш. 103025 -АДБ-3122У1 № 468 на пр.1-П-2,5 1986 г. ш. 0153 | г. Минск, в/ч 63755 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 337 | Мастерская ПМ-2-70 № Р35128 1984 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № б/н на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 588075 дв. 146914 -МРС-АР № 84056 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 583511 дв. 120579 -ТА-5 № Р35128 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 580404 дв. 110351 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № ГВ23602329 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 212782 -АДБ-309У1 № 8183 на пр.1-П-2,5 1984 г. ш. 0420 | г. Минск, в/ч 63755 | 108 000 000 | 10 800 000 |
| 339 | Мастерская ПМ-2-70 № П35168 1984 г. 4 кат. в составе: -МРМ-М1 № 094 на ЗИЛ-131 1984г ш. 585931 дв. 136437 -МРС-АР № 84067 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 554874 дв. 983662 -ТА-5 № П35168 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 554324 дв. 980470 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № ИМ23649504 на пр.1-П-1,5 1977 г. ш. 119661 -АДБ-3120У1 № 4317 на пр.1-П-2,5 1983 г. ш. 0088 | г. Минск, в/ч 63755 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 340 | Мастерская ремонтная слесарная МРС-АР № 82089 ЗИЛ-131 ш. 532801 дв. 876919 1982 г. 4 кат. 4935 км | г. Минск, в/ч 63755 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 341 | Мастерская ПМ-2-70 № К351048 1978 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 656 на ЗИЛ-131 1978 г. ш. 326182 дв. 787476 -МРС-АР № 78159 на ЗИЛ-131 1978 г. ш. 322005 дв. 765351 -ТА-5 № 351048 на ЗИЛ-131 1979 г. ш. 340196 дв. 864015 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № ИЛ2345396 на пр.1-П-1,5 1978 г. ш. 116572 -АДБ-309У1 № б/н на пр.1-П-2,5 1979 г. ш. 0217 | г. Минск, в/ч 63755 | 98 000 000 | 9 800 000 |
| 342 | Мастерская ПМ-2-70 № Е351050 1976 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 669 на ЗИЛ-131 1978 г. ш. 323194 дв. 771447 -МРС-АР № 313 на ЗИЛ-131 1980 г. ш. 403483 дв. 200761 -ТА-5 № Е351050 на ЗИЛ-131 1976 г. ш. 191672 дв. 39399 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № 02760662 на пр.1-П-1,5 1976 г. ш. 91656 -АДБ-309У1 № б/н на пр.1-П-2,5 1976 г. ш. 55406 | г. Минск, в/ч 63755 | 95 000 000 | 9 500 000 |
| 344 | Мастерская ПМ-2-70 № П35126 1983 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 207 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 538638 дв. 898995 -МРС-АР № 83065 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 534607 дв. 861440 -ТА-5 № П35126 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 529538 дв. 855719 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № СУ214 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 138900 -АДБ-309У1 № 1932 на пр.1-П-2,5 1982 г. ш. 10597 | г. Минск, в/ч 63755 | 105 000 000 | 10 500 000 |
| 345 | Мастерская ПМ-2-70 № К351050 1979 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 171 на ЗИЛ-131 1978 г. ш. 285474 дв. 572113 -МРС-АР № 256 на ЗИЛ-131 1978 г. ш. 316955 дв. 735863 -ТА-5 № К351050 на ЗИЛ-131 1979 г. ш. 340857 дв. 867082 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № 02760680 на пр.1-П-1,5 1976 г. ш. 92201 -АДБ-309У1 № 9753 на пр.1-П-2,5 1979 г. ш. 0203 | г. Минск, в/ч 63755 | 98 000 000 | 9 800 000 |
| 346 | Мастерская ПМ-2-70 № Р35137 1984 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 097 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 827226 дв. 270713 -МРС-АР № 83073 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 536521 дв. 888978 -ТА-5 № Р35137 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 582269 дв. 120009 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № ГВ23602321 на пр.1-П-1,5 1984 г.ш. 204147 -АДБ-3120У1 № 10907 на пр.1-П-2,5 1984 г. ш. 0692Т | г. Минск, в/ч 63755 | 108 000 000 | 10 800 000 |
| 347 | Мастерская ПМ-2-70 № Е351056 1976 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № б/н на ЗИЛ-131 1976 г. ш. 812415 дв. 161926 -МРС-АР № 77071 на ЗИЛ-131 1977 г. ш. 250875 дв. 330983 -ТА-5 № Е351056 на ЗИЛ-131 1976 г. ш. 620560 дв. 304186 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № ТИ23628346 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 201284 -АДБ-309У1 № б/н на пр.1-П-2,5 1976 г. ш. 92653 | г. Минск, в/ч 63755 | 95 000 000 | 9 500 000 |
| 349 | Мастерская ПМ-2-70 № П35124 1983 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 206 на ЗИЛ-131 1983 г. ш. 528053 дв. 877902 -МРС-АР № 82092 на ЗИЛ-131 1982 г. ш. 493757 дв. 670155 -ТА-5 № П35124 на ЗИЛ-131 1983 г.ш. 528420 дв. 850615 -ЭСБ-4ВЗ-1М1 № СУ236184 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 180979 -АДБ-3120У № 10620 на пр.1-П-2,5 1983 г. ш. 1963 | г. Минск, в/ч 63755 | 105 000 000 | 10 500 000 |
| 350 | Мастерская МТО-В № 044 на ЗИЛ-131 ш. 574524 дв. 082618 1985 г. 2 кат. 746 км | г. Минск, в/ч 63755 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 351 | Мастерская МТО-В № Х35111 на ЗИЛ-131 ш. 7781016 дв. 051171 1988 г. 2 кат. 1287 км | г. Минск, в/ч 63755 | 124 000 000 | 12 400 000 |
| 352 | Мастерская МТО-В № 042 на ЗИЛ-131 ш. 632575 дв. 486140 1982 г. 4 кат. 1484 км | г. Минск, в/ч 63755 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 353 | Мастерская МТО-В № 041 на ЗИЛ-131 ш. 475253 дв. 377389 1982 г. 4 кат. 995 км | г. Минск, в/ч 63755 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 354 | Мастерская МТО-В № 050 на ЗИЛ-131 ш. 594186 дв. 557283 1985 г. 4 кат. 471 км | г. Минск, в/ч 63755 | 62 000 000 | 6 200 000 |
| 355 | Мастерская МТО-В № Л35123 на ЗИЛ-131 ш. 388699 дв. 119870 1980 г. 4 кат. 2910 км | г. Минск, в/ч 63755 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 356 | Мастерская МТО-В № М35122 на ЗИЛ-131ш. 431193 дв. 347328 1981 г. 4 кат. 1755 км | г. Минск, в/ч 63755 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 357 | Мастерская МТО-В № У35102 на ЗИЛ-131 ш. 721121 дв. 775586 1987 г. 2 кат. 6846 км | г. Минск, в/ч 63755 | 121 000 000 | 12 100 000 |
| 358 | Мастерская МТО-В № Р35168 на ЗИЛ-131ш. 610636 дв. 255516 1984 г. 4 кат. 2937 км | г. Минск, в/ч 63755 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 359 | Мастерская МТО-В № 014 на ЗИЛ-131 ш. 561459 дв. 017598 1984 г. 4 кат. 1628 км | г. Минск, в/ч 63755 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 365 | Мастерская МРМ-М1 № 543 на ЗИЛ-131 ш. 631195 дв. 355159 1985 г. 4 кат. 2648 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 165 | Автошасси КамАЗ-43101 ш. 003220 дв. 474421 1989 г. 3 кат. 93361 км | г. Гродно, в/ч 41780 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 296 | Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. МО172411 дв. 771286 1991 г. 3 кат. 85204 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 40 000 000 | 4 000 000 |

**Условия и порядок проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 147 от 09.08.2013 г.**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных вблизи озера Селява.

Организатор аукциона:

**Холопеничский сельский исполнительный комитет,**

222024, г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5 Крупского района Минской области

| № лота | Кадастровый номер, адрес земельного участка, номер участка | Площадь (га) | Наличие инженерных сетей | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 623086307401000042, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Клишино, участок № 23 | 0,1500 | Имеется электричество, подъездные пути | 2 550 750 | 255100 бел., руб. р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |
| 2. | Земельный участок с кадастровым номером 623086307401000043, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Клишино, участок № 24 | 0,1500 | | 2 550 750 | 255100 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |
| 3. | Земельный участок с кадастровым номером 623080701101000033, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Великие Хольневичи, участок № 3 | 0,1468 | | 2 362 800 | 236300 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |
| 4. | Земельный участок с кадастровым номером 623086300901000044 расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Великие Хольневичи, участок № 5А | 0,1500 | | 2 416 500 | 241650 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |
| 5. | Земельный участок с кадастровым номером 623086300901000042, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Великие Хольневичи, участок № 25 | 0,1500 | | 2 416 500 | 241650 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |
| 6. | Земельный участок с кадастровым номером 623086300901000041, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Великие Хольневичи, участок № 28 | 0,1575 | | 2 532 850 | 253300 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810, филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет |

Аукцион состоится **4 октября 2013 г. (пятница) в 11.00** по адресу: г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5, 2-й этаж, зал заседаний. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 30 сентября 2013 г. (включительно)** по адресу: г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5, Холопеничский сельисполком, кабинет № 6 (в рабочие дни до 17.00, суббота до 13.00).

Возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, и расходов по подготовке документации, необходимой для его проведения, производится победителем аукциона. Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях яго проведения.

**Контактные телефоны: (801796) 53 2 43, 53 2 28, 8 029 128 67 23.**

■ Мая праўда

# НЕ «КАРМІЦЕ» ТРОЛЯ АПРАЎДАННЯМІ

# КАБ ЗАВАЯВАЦЬ ІНТЭРНЭТ-ЧЫТАЧА — ПАЗЛУЙ ЯГО?

*Днямі наш рэдакцыйны кабінет перапоўніўся эмоцыямі... Маладой журналістцы Ганне было даручана правесці эксперымент: высветліць, як адчувае сябе іншаземны госць у сталічных кавярнях. Напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі, пагадзіцеся, тэма даволі цікавая, бо, як справядліва заўважыла потым у матэрыяле Ганна, кожнаму чалавеку рана ці позна пачынае хацецца не толькі відовішчаў, але і проста «хлеба». Задача была простая: наведаць некалькі папулярных мінскіх кавярняў і з пазіцыі «іншаземца» падзяліцца ўражаннямі (няхай і суб'ектыўнымі) ад узроўню абслугоўвання. Ролю турысткі з Германіі пагадзілася выканаць перакладчык Дзіна Грыцкевіч. Пасля выхаду матэрыялу ў «Звяздзе» яго перадрукавалі ў інтэрнэце, і тут пачалося тое, чаго аўтарка артыкула ніяк не чакала. Замест абмеркавання ўласна абазначанай тэмы, інтэрнэт-супольнасць пакрысе перайшла ў тым ліку і... на асобы саміх удзельнікаў эксперыменту. Дакладней, актывізаваліся так званыя «тролі» — асобы, што дапускаюць грубыя або правакацыйныя выказванні, перашкаджаючы абмеркаванню, увогуле займаючы блюзнерствам ці нават абражаючы іншых... Карацей кажучы, аўтар матэрыялу адчула сапраўдны шок: і за сябе, і, найперш, за галоўную ўдзельніцу эксперымента, якую яна, выходзіць, «падставіла»... Як толькі «напал страсцей» крыху суцішыўся, тэма «Маёй праўды» ўзнікла сама сабой. Да якой высновы ў выніку прыйдуць калегі?*



**Тролі, Ганна, з'явіліся не сёння і нават не ўчора. Яны былі заўсёды, толькі называлі іх па-рознаму. Суседку, што мела «доўгі язык», — пляткаркай. Аднакласніка, які праходу не даваў, — задзірам. Сваяка, якому б што ні рабіць, абы не працаваць, — балбатуном. Зайздрослівага калегу па працы — шаптуном. Кожны з гэтых тыпажоў уздзейнічаў на навакольных сваім шляхам — словамі, учынкамі; меў уласныя, толькі яму вядомыя мэты. Але па сутнасці ўсе яны ў сучасным разуменні былі тролямі, бо бессаромна кралі чужы час, абражалі — у вочы або не, «падседжвалі»...**

Галоўным было зразумець, што такі чалавек спецыяльна выкарыстоўвае цябе для дасягнення нейкіх сваіх планаў. І зрабіць высновы. Пляткарцы паказаць на дзверы. Пры шаптунах не казаць нічога лішняга. «Энергетычнаму вампіру», які любіць паплакацца ў чужую «камізэльку, рашуча адмовіць у чарговай сустрэчы.

...Памятаю, як у школе да мяне без дай прычыны пачаў пастаянна чапляцца аднакласнік, здаровы не па гадах бугай. Літаральна праходу не даваў. У чарговы раз на яго выпад я адказаў нешта рэзкае. Той адразу: «Пайшлі выйдзем!» А злосці на аднакласніка ўжо было столькі, што я без ваганняў адказаў: «Пайшлі!» Вядома, усе хлопцы тут жа сабраліся побач: як жа, зараз бойка будзе! Нават не бойка, бо я супраць задзіры — як тая моська супраць слана. І вось усе разам спускаемся мы з трэцяга паверха ў школьны двор. Іду, і думка толькі адна: як паспець усю сілу і злосць укласці ў адзіны ўдар, бо другога шанца не будзе... Аднакласнік, відаць, па маіх вачах зразумеў, што я гатовы літаральна ў горла ўчапіцца. І адступіў. І больш ніколі не чапаў, нават, дзіўная рэч, часам паддобрываўся.

...Ці вось яшчэ прыклад з ранейшага прывяду. Тэлефануе чалавек і задае пытанне кшталту: «Ці маю я права на годны ўзровень жыцця?» Вядома, гэта нават у Канстытуцыі прапісана. Далей без пераходу гучыць чарговае пытанне прыкладна такога зместу: «Дык чаму тады, каб атрымаць даведку, мне давялося зайсці ў тры кабінеты? А як жа разрэкламаваная служба «аднаго акна»? Кабінеты, высвятляецца, размяшчаліся побач, даведку грамадзянін атрымаў, і атрымаў хутка. Аднак які пафас і літаральнае разуменне сітуацыі! «А як жа «адно акно»?»...

Іншым разам заяўнік пачынае скардзіцца на сваю бяду: падрабязна, слёзна, паўтараючы, што нікому да яго справы няма. Размова доўжыцца доўга, усё занатоўваецца, удакладняецца. А потым неяк нечакана высвятляецца (добра, калі на гэтай стадыі), што грамадзянін гэты, вырашаючы сваё пытанне, прайшоў усе магчымыя судовыя інстанцыі, неаднойчы звяртаўся ў шматлікія ўстановы і арганізацыі. Але безвынікова, бо заканадаўства не на яго баку. «Ну, раз вы не хочаце мне дапамагчы ці баіцеся, я буду звяртацца ў іншае месца»... А справа ж не ў нежаданні дапамагчы, а ў тым, што чалавек неяк адмыслова разумее сваю праву — насуперак пэўным агульнапрынятым нормам або закону.

...А потым пералічаныя вышэй і іншыя тыпажы прайшлі ў інтэрнэт. Там ім яшчэ нават больш зручна, чым у рэальным жыцці. Бо ананімнасць практычна поўная: ні твайго твару, ні адраса, ні нават почырку і голасу ніхто не ведае. Затое сам троль можа сабе дазволіць тое, што, магчыма, не рызыкнуў бы зрабіць наяве. Ты гэта, Ганна, як прадстаўнік больш маладога пакалення і актыўны карыстальнік інтэрнэту, ведаеш лепш за мяне: седзячы ў адным кабінеце, мы неаднаразова абмяркоўвалі каментарыі і іх далікатнасць у дачыненні да матэрыялаў калег. Проста ты ўпершыню трапіла ў сітуацыю, калі сама аказалася на «вастрыі». Але, па-першае, як журналіст павінна была быць гатовай да такой сітуацыі. Рана ці позна гэта павінна было здарыцца. Па-другое, трэба было спакойна паставіцца да таго, што адбылося. Гэта тое ж, што і ў медыкаў: калі хваробу кожнага пацыента прымаць блізка да сэрца, сам урач праз нейкі час працаваць ужо не зможа. Сваю журналісцкую працу ты выканала добра: напісала матэрыял, які «зачапіў» многіх. Значыць, пэўная праблема ёсць?!. І разумны, выхаваны чалавек абмяркоўваў бы менавіта яе, шляхі вырашэння, а не скіроўваў увагу на асобу аўтара. Зараз ці не кожны карыстальнік інтэрнэту ўяўляе сябе прафесійным журналістам. Мы з табой ведаем, што гэта не так. Часам далёка не так. Напэўна, і самі яны, тролі, тое недзе адчуваюць, адсюль і гнюсныя выпады? А журналіст не хаваецца за «нікамі», нясе адказнасць за факты, не можа дазволіць сабе некарэктныя выразы.

Увогуле, як даволі часта адбываецца абмеркаванне на форумах? Чытаць можна першыя калі 20-30 каментарыяў, калі 50. Далей тэма забываецца («забіваецца»), паміж сабой удзельнікі пачынаюць абменьвацца фразамі кшталту «сам дурань». Гэта яны, тролі, пачынаюць несці бязглуздзіцу, паўтараць відавочнае, бясконца цытаваць. Галоўнае для іх — хаця б нешта сказаць, хаця б і бессэнсоўны набор гукаў. Толькі б пагучней. А ўжо каб азнаёміцца з першакрыніцай, а не браць пад увагу толькі кароткі пераказ зместу, зроблены не без купюр зацікаўленымі інтэрнэт-сайтамі — дзе там?.. Дарэчы, таксама цікавае пытанне. Да сістэмных адміністратараў і да кіраўніцтва або ўладальнікаў сайтаў: а навошта каментарыі, якія па сутнасці не адносяцца да тэмы абмеркавання, а толькі адцягваюць увагу, не нясуць у сабе нічога новага ці нават абражаюць людзей, дапускаць у «эфір»? Ці не тролінг гэта таксама, толькі на іншым узроўні?..

Я разумею, Ганна, што супакойваць і даваць парады лёгка. Насамрэч зацкаваць можна любога, калі задацца мэтай. Як змагацца з тролямі і ці трэба гэта рабіць увогуле? Калі цябе моцна зачапілі, калі справа прымае сур'ёзны абарот (напрыклад, ёсць пэўная рэальная пагроза), можна і ў «горла ўчапіцца» — звярнуцца ў міліцыю. У астатніх выпадках, напэўна, лепш проста пашкадаваць гэтых людзей. Не ўступаць з імі ў перапіску, не спрачацца. Проста не звяртаць на іх увагі. Тролі сілкуюцца нашай энергіяй, нашымі эмоцыямі. Дык навошта іх гэтым «карміць»?

Напрыканцы літаральна два словы пра Дзіну, якая пагадзілася дапамагчы табе, Ганна, з журналісцкім эксперыментам. Яна, без перабольшвання, заслугоўвае слоў падзякі. Не толькі за падтрымку праекта, а ўвогуле за тое, што яна сапраўды смелы чалавек. А да такіх людзей дрэннае ніколі не прычэпіцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



**Мне вельмі не хочацца верыць, што гэта праўда, але, здаецца, прыйдзецца. Нават паслухаўшы ўсе парады старэйшых калег пра тое, што да абразлівых каментарыяў над сваімі матэрыяламі ў інтэрнэце трэба ставіцца нейтральна, я ўсё роўна не магу ўспрымаць іх спакойна і, відаць, ніколі не навучуся гэтаму. Чытаючы опусы інтэрнэт-троляў, больш за ўсё хачу зразумець: ну адкуль у людзях столькі злосці?**

За тыя нядоўгія два гады, на працягу якіх я працую журналістам, востра адчуць увесь цяжар «грамадскай думкі» давялося толькі нядаўна. Мой матэрыял, які расказваў пра «моўны» эксперымент у мінскіх кавярнях, з'явіўся на адным з інтэрнэт-парталаў. Артыкул (дакладней, вытрымкі з яго) у няпоўным варыянце і з перайначаным загалоўкам так і напрошваўся на тое, каб «тут і цяпер» пачаць жорстка лаяцца і самым грубым чынам «надаваць кухталёў» аўтару за непрафесіяналізм. Пры гэтым тэкст на партале быў перакладзены на рускую мову альбо анлайн-перакладчыкам, альбо не надта адукаваным чалавекам. Ну як, скажыце, можна фразу «колькі часу спатрэбілася на прагляд меню», якая па-руску гучала б як «какое-то время понадобилось...» перакласці даслоўна, проста замяніўшы «колькі» на «сколько»? Нават школьнікі разумеюць, што сэнс атрымліваецца зусім іншым. Традыцыйна спасылка на першакрыніцу была пазначана дробным шрыфтам унізе. Большасць людзей проста не ўзгадае, што туды нядрэнна было б зазірнуць, перш чым рабіць высновы.

Але ж вернемся да таго моманту, дзе сказана было пра мой непрафесіяналізм. Гэта я яшчэ магу зразумець: калі дзяўчына, што параўнальна нядаўна атрымала дыплом, паспела б асабліва таго прафесіяналізму набрацца? Мяне «дабілі» каментарыі, у якіх не самымі прыстойнымі словамі абмяркоўваліся... рост, знешнасць, адзенне, узровень інтэлекту і асоба дзяўчыны, якая для артыкула згадзілася сыграць ролю нямецкай турысткі.

— Аня, а табе нічога за гэта не будзе? — тэлефанавала мне пасля Дзіна, адукаванасцю і выхаванасцю якой усе яе знаёмыя аднадушна захапляюцца. Дзяўчына была вельмі засмучана, бо шчыра не разумела, што ж такога агіднага яна зрабіла, выклікаўшы ў грамадскасці адпаведную рэакцыю.

Не, мне за гэта нічога не будзе. Нават наадварот, па сучасных мерках я дасягнула поспеху, прымусіўшы шаноўную інтэрнэт-грамадскасць траціць свой час на выдумлянне мудрагелістых злосных каментарыяў. Толькі вось неяк сумна ўсё гэта...

Дарэчы, пра знешнасць. Пішучы ўжо гэты матэрыял і ведаючы, што ён выйдзе са здымкам, толькі і застаецца здагадвацца, «цягніком» ці «самазвалам» могуць «праехацца» па маіх вачах, вушах, носе і ўсім астатнім магчымыя аўтары каментарыяў. Але я, як ні дзіўна, не хвалююся. Ці трэба ўжо мне, звычайнай дзяўчыне, крыўдаваць, калі дастаецца за знешнюю недасканаласць нават прыгажуням-мадэлям з конкурсаў. Асабліва «цэняцца» здымкі, дзе сфатаграфаваны дзяўчаты ў купальніках. Што тут пачынаецца! «Дзяўчына на першай фотцы — нічога такая, а тую, што на трэцяй — у «качалачку» тэрмінова!», «Фу-у-у, цэлюліт...» Водгукі «шаноўнага журы» проста трашчаць ад намылак і нецэнзурных слоў, якія тут, думаю, паўтараць не варта.

Мне ў такіх выпадках адразу ўяўляецца прыкладна наступнае: сядзіць, значыць, недзе за камп'ютарам чалавек, якому для поспеху ў жыцці больш карысна было б, напрыклад, арфаграфічны слоўнік пачытаць, а не фоткі напаўаголеных дзяўчат разглядваць. Сядзіць сабе ў растаптаных пантофлях і пераборліва так разважае: «Фу, што за нос! А ў гэтай сцёгны шыракаватыя, такая страшная!» Адкуль гэткае прадузятае стаўленне да чужой знешнасці ў асоб, смеласці якіх хапае хіба што назвацца якім-небудзь нікам і замест свайго фота паставіць карцінку з мядзведзікам? Калі вяртацца да абмеркаванняў здымкаў з конкурсаў прыгажосці, дык, па-мойму, гэта падобна да разважанняў пра дарагое элітнае віно, якое чалавек, што ўпарта гаворыць пра ўсе яго мінусы, ніколі не каштаваў. У людзей, побач з якімі гэтыя самыя прыгажуні-мадэлі сапраўды «круцяцца», наўрад ці ёсць час разглядаць іх здымкі ў інтэрнэце і пісаць розную лухту.

Добра, манекеншчыкаў пакінем у спакоі. Але ж рознымі жахлівымі выразамі каментуюць нават навіны, у якіх паведамляецца пра трагедыі. Нядаўна ў беларускай інтэрнэт-прасторы актыўна абмяркоўвалі забойства маладой жанчыны. У адным з тэкстаў мімаходзь згаданы быў той факт, што жанчына гэтая некалькі гадоў таму развялася з мужам, у яе застаўся маленькі сын. Пасля скасавання шлюбу яна жыла з іншым чалавекам, не рэгіструючы адносіны. У артыкуле аўтар называў нябожчыцу «жанчынай з дзіцем», а гэтага мужчыну — «грамадзянскім мужам». Рэакцыя не прымусіла сябе чакаць: «Што за «новояз», паважаныя журналісты? Рэчы трэба называць сваімі імёнамі: не «жанчына з дзіцем», а «развядзёнка», і не «грамадзянскі муж», а «сужыцель». Ды ці не ўсё роўна цяпер, калі жанчыны, якая павінна называцца «развядзёнкай», ужо няма ў жывых? Здаецца, у такіх выпадках звычайна маўчаць, у крайніх выпадках — перадаюць спачуванні родным і блізкім...

Вельмі верагодна, што ў кагосьці мае «свежанькія» эмоцыі, якія пераўвасобіліся ў гэты матэрыял, выклічуць смех. Старэйшы калега вось гаворыць аб прафесійным цынізме. Можа, гэта і патрэбная якасць, якая дазволіць мне зберагчы нервовыя клеткі...

...Пагаджуся, што меркаваць пра ўчынкі і словы іншых — гэта справа няўдзячная, рана ці позна цябе таксама за нешта асудзяць. Не, шаноўныя тролі, я не асуджаю вас. Проста хачу зразумець адну рэч. Вы ўсімі сіламі паказваеце, што неабыякавыя да навакольнага свету і падзей у ім, не хочаце маўчаць, тлумачачы сваё стаўленне да ўсяго. Ад тых слоў, якімі выказваеце свае пачуцці, ледзь не расколваецца манітор камп'ютара. І ў той жа час, чаму вы больш чым абыякавыя да... саміх сябе? Ну няхай для вас пішуць не самыя лепшыя журналісты, на здымках да артыкулаў вы бачыце не самых прыгожых дзяўчат, у долара курс зноў не такі, як хацелася б, а ў крамах усё дорага. Замест таго, каб траціць час на напісанне абразлівых слоў, паспрабуйце ўстаць з-за камп'ютара, разабрацца з праблемамі, якія непакояць, і ЗРАБІЦЬ што-небудзь для таго, каб павярнуць сваё жыццё да лепшага. Вось тады неабыякавасць да сябе знікне, а з ёй прападзе і неабходнасць ператвараць усё, што «накіпела», у пранізаныя злосцю выразы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ** ■

# НЕ ЗНАХОДКА, А СЕНСАЦЫЯ!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Археолаг удзячны мсціслаўскім уладам, а таксама мясцовым службам МНС і аховы прыроды за апаратыўную падтрымку і бездакорна арганізаваную працу. На Віхру прыехалі працаваць спецыялісты са сталічнага дайвінг-цэнтра «Марскі пегас» на чале з Андрэем Ліхачовым.

Дзякуючы агульным намаганням, упершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі адбыліся маштабныя падводныя раскопкі. Людзі, узброеныя самым сучасным абсталяваннем, працавалі трое сутак, начныя змены праходзілі пры святле магутных ліхтароў. І ўсё гэта пад дажджом. Як у кіно — усё дзеля выніку.

І ён ёсць: гэта даспехі ўзброенага рыцара пачатку XVI стагоддзя. Прычым Ігар Марзалюк называе дакладную дату, калі гэты мсціслаўскі ваяр загінуў. Паводле гістарычных пісьмовых крыніц, на пачатку лістапада (па старым стылі) 1502 года пад Мсціславам адбылася вялікая сеча паміж маскоўскім войскам і рыцарамі Вялікага Княства Літоўскага на чале з мсціслаўскім князем. Маскоўскае войска пабіла ў той раз мсціслаўцаў: палеглі тысячы, многіх узялі у палон. Сам князь ледзь паспеў ускочыць у браму замка...

Магілёўскі гісторык сёння мяркуе, што мсціслаўскі рыцар загінуў пры абароне пераправы праз Віхру — ён упаў разам з канём у раку (астанкі археолагі знайшлі таксама).

Ігар Марзалюк паказвае фотаздымкі са свайго фотаархіва. Найбольш унікальная рэч — гэта шлем «салада» германскага паходжання. У знойдзенага ў Віхры ўзору ёсць забрала і «хвост амара» на патыліцы. Ён чымсьці нагадвае галаўны ўбор лорда Вэйдэра з «Зорных войнаў».





На фота археолагі і дайверы трымаюць у руках часткі даспехаў, нібыта немаўлят — асцярожна і з гонарам, а на тварах суровых мужчын — задаволеныя ўсмешкі.

— Вельмі задаволеныя, таму што такіх даспехаў у поўным камплекце няма ні ў адным беларускім музеі, раней знаходзілі толькі фрагменты, — каментуе Марзалюк. — У нас ёсць даспехі цалкам, разам з пальчаткамі і каванымі рыцарскімі чаравікамі. Усё захавалася вельмі добра, таму што ляжала на дне ракі без доступу кіслароду — у яміне, пад пластом глею, ціны і пяску. Вы не паверыце, але захаваліся рэшткі не толькі кальчугі, але таксама ільняной кашулі і адзення з лямцу і скуры, якія надзявалі пад латы.

Гісторык лічыць, што даспехі гэтага заможнага рыцара, хутчэй за ўсё зрабілі ў Нюрнбергу, і выглядалі яны вельмі прыгожа. Калі не сказаць па-сучаснаму — «гламурна»: выдатная сталь, а на ёй латунныя накладкі, якія блішчэлі, як золата.

Вядома, больш чым праз пяць стагоддзяў даспехі выглядаюць для неспецыяліста як кавалкі ржавага жалеза, але рэстаўратары будуць старанна працаваць з імі.

Цяпер знаходка захоўваецца ў Мсціславе, дзе робяць яе часовую кансервацыю. Найбольш прэзентабельныя фрагменты — шлем і кірасу — пакажуць гасцям Дня беларускага пісьменства ў Быхаве. У гэтыя выхадныя дні археалагічная сенсацыя будзе выстаўлена ў экспазіцыі на тэрыторыі Быхаўскага замка. Праўда, даспехі будуць ляжаць у акварыуме з дыстыляванай вадой, каб не пашкодзіць каштоўнасці.

— Калі мы знайшлі іх, то я, калі шчыра, зведаў самыя моцныя эмоцыі ў сваім жыцці, — прызнаецца Ігар Марзалюк. — Гэта асабістае: мае родзічы па маці, верагодна, былі ў гэтым мсціслаўскім гарнізоне. Але і грамадскае: у мяне сэрца баліць ад таго, як рабуюць нашу спадчыну. Шмат людзей, і не толькі з Беларусі, імкнуцца здабыць старажытныя рэчы і зарабіць на гэтым.

З гэтай прычыны магілёўскі гісторык, які з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ад Магілёўскай вобласці, мае намер выступіць на бліжэйшай сесіі ў верасні.

— Я паведамлю калегам пра сітуацыю, маё выступленне ўжо ўнесена ў парадак дня, — сказаў сенатар. — Нам неабходна тэрмінова прыняць жорсткі закон у дачыненні да незаконных капальнікаў даўніны. Падобнае цяпер уступае ў сілу ў Расійскай Федэрацыі, таму ёсць рэальная небяспека, што «чорныя» археолагі з таго баку мяжы масава перабяруцца ў бліжэйшыя Віцебскую і Магілёўскую вобласці. Мы застаемся безабароннымі, а таму трэба рабіць адпаведныя захады.

Што датычыцца канкрэтна Мсціслава, то, паводле дамоўленасці з уладамі, месца на Віхры, дзе праходзілі падводныя раскопкі, патрулюецца і ахоўваецца. Праз тыдзень Ігар Марзалюк разам са студэнтамі ўніверсітэта зробіць разведку наваколля, а з ранняй вясны наступнага года археолаг абяцае пачаць буйнамаштабныя даследаванні на Мсціслаўшчыне.

**Ілона ІВАНОВА,**
**Фота з архіва Ігара МАРЗАЛЮКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1753** год — 260 гадоў таму пры Віленскім універсітэце была заснавана Віленская астранамічная абсерваторыя. Гэта адна з самых старых астранамічных абсерваторый у Еўропе. Адным з арганізатараў і першым яе дырэктарам быў М. Пачобут-Адляніцкі. У абсерваторыі ў розны час працавалі П. Славінскі, М. Глушневіч, М. Гусеў і іншыя вучоныя, навуковая і асветніцкая дзейнасць якіх мела вялікае значэнне ў распаўсюджванні ў Беларусі і Літве прыродазнаўчых ведаў. У 1753-65 гадах абсерваторыя існавала як астранамічны кабінет. Пасля набыцця больш сучасных астранамічных інструментаў, з 1773 года, праводзіліся сістэматычныя назіранні планет, астэроідаў, камет, зацьменняў Сонца і Месяца. Першая ў Расіі пачала астрафізічныя даследаванні: з 1864 года асноўны напрамак — вывучэнне фатаграфічнымі метадамі паверхні Месяца і фізічных з'яў , якія адбываюцца на Сонцы. Праводзіліся таксама метэаралагічныя назіранні; віленскія астраномы прымалі ўдзел у вызначэнні геаграфічных каардынат населеных пунктаў і ў геадэзічных экспедыцыях на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Курляндскай губерняў. Абсерваторыя мела вялікую бібліятэку, у 1843-46 гадах выдавала свае навуковыя працы. Спыніла дзейнасць пасля пажару ў 1876-м.



**1700** год — цар Пётр I абвясціў вайну Швецыі, лічачы галоўным прыярытэтам знешняй палітыкі Расіі выхад да Балтыйскага мора і вяртанне захопленых Швецыяй у пачатку XVI стагоддзя земляў. Прэтэнзіі да Швецыі меў таксама і польскі кароль Аўгуст II, які аформіў у 1699 годзе з Пятром I Паўночны Саюз супраць Швецыі, а пазней да іх далучылася і Данія. Швецыя была тады найбольш магутнай дзяржавай у рэгіёне, войска яе налічвала каля 150 тысяч чалавек, яно было добра ўзброена і мела багаты вопыт ваенных дзеянняў, таму па праве лічылася найлепшым у Заходняй Еўропе. Шведскі флот налічваў 42 лінейныя караблі і 12 фрэгатаў (гэта 13 тысяч чалавек). Расія ж, хоць і валодала велізарнай арміяй (каля 200 тысяч чалавек), але была досыць слабая эканамічна, ды і ўзбраенне пакідала жадаць лепшага. Флоту на гэтым перыядзе ваенных дзеянняў у Расіі не было зусім. Вайна атрымала назву Паўночнай і доўжылася 21 год. Руская армія, пачаўшы яе з разгромных паражэнняў, пад канец так падужэла і вырасла прафесійна, што шведы вымушаны былі заключыць мір. У 1721 годзе быў заключаны Ніштацкі мір, па якім Расія атрымлівала ў вечнае карыстанне Ліфляндыю, Эстляндыю, Інгрыю і частку Карэліі з Выбаргам, а Пётр I, у сваю чаргу, вяртаў шведам Фінляндыю і 2 мільёны рублёў. Першае акно ў Еўропу было прабіта.

**1948** год — нарадзіўся (горад Мінск) Георгій Аляксандравіч Шышко, беларускі вучоны ў галіне педыятрыі, доктар медыцынскіх навук (1992), прафесар (1996). Аўтар навуковых прац па неанаталогіі, інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных.

Было сказана

**Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык:**

**«Не тое, каго майстар малюе, а толькі тое, як ён гэта робіць, толькі здольнасць і ўлежнасць яго могуць малюнку хвалу і каштоўнасць надаваць».**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.14 | 20.05 | 13.51 |
| Віцебск | 6.01 | 19.57 | 13.56 |
| Магілёў | 6.04 | 19.55 | 13.51 |
| Гомель | 6.04 | 19.49 | 13.45 |
| Гродна | 6.30 | 20.19 | 13.49 |
| Брэст | 6.33 | 20.17 | 13.44 |

**Месяц**

*Апошняя кварта 28 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

*Пр. ТРЭЦІ СПАС, Аляксандра, Дзяміда.*
*К. Сабіны, Віталя, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +18..+22°С | КІЕЎ | +14..+16°С | РЫГА | +13..+15°С |
| ВІЛЬНЮС | +16..+20°С | МАСКВА | +14..+16°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +18..+20°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка знайшла ў інтэрнэце параметры ідэальнай фігуры. Памерала сябе... Выявіла ў іх некалькі сур'ёзных памылак.**

Дзяўчына з хлопцам збіраюцца жыць разам і абмяркоўваюць магчымыя бытавыя праблемы. Яна:

— Значыць я буду гатаваць і прыбіраць. А ты што будзеш рабіць?

Хлопец:

— Я буду есці мяса.

— А з карысная?

— А з карыснага — гародніну.

**Няўважлівы пасажыр Іваноў, бразнуўшы дзвярыма купэ, не заўважыў руку і ацаліў глуханямога прадаўца часопісаў.**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.974. Індэкс 63850. Зак. № 3696.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 жніўня 2013 года.